ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 8 (1082) 23 лютага 2013 г. Кошт 4000 рублёў.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

23 лютага — Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь

Фота Юрыя ІВАНОВА

ПАД МАРШ ВАЕННАГА АРКЕСТРА

С. 6

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МЮЗІКЛ: ЧАМУ "ПАД КЛЮЧ" НЕ АТРЫМАЛАСЯ?

С. 4

НОВЫЯ ЭКСПАНАТЫ МУЗЕЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

С. 2

ІНСТЫТУТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ НА ПАЛОСАХ "К"

ПК

С. 13

ГАЛЕРЭЯ ПЭНА Ў ВІЦЕБСКУ: ШТРЫХІ КАНЦЭПЦЫІ

С. 3

С. 10—11

БРЭНД ЖЫВЕ Ў... ВЁСЦЫ!

Магілёў: тройчы сталіца

20 лютага ў Магілёве адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння гораду сертыфіката "Культурная сталіца Садружнасці Незалежных Дзяржаў 2013". Самой імпрэзе папярэднічала прэс-канферэнцыя, на якой журналісты мелі магчымасць задаць пытанні прадстаўнікам кіраўніцтва вобласці і горада, міністэрстваў культуры і інфармацыі, каардынацыйных органаў Садружнасці, акрэдытаваным у Беларусі дыпламатам краін СНД, дзеячам культуры.

Выстаўка работ народных майстроў Магілёўшчыны ў фае абласнога Палаца культуры.

Статус Культурнай сталіцы СНД Магілёў сёлета дзеліць з азербайджанскім горадам Габала і армянскім — Гюмры. Культурныя сталіцы вызначаюцца ў Садружнасці трэці год запар. У 2011-м імі былі наш Гомель і расійскі Ульянаўск, летась — казахстанская Астана і туркменскі горад Мары. Дагэтуль праект лічыўся, так бы мовіць, пілотным. Цяпер жа, калі стала зразумела, што справа гэтая — вартая, перспектыўная, калі напрацаваны вопыт дазволіў вызначыць крытэрыі — праект пераходзіць у новую якасць. Цяпер штогод у Садружнасці будзе менавіта тры Культурныя сталіцы. Краіны ж, да якіх належаць гэтыя гарады, у праекце будуць чаргавацца ў алфавітнай паслядоўнасці.

На прэс-канферэнцыі прагучала пытанне: чаму беларускі горад атрымаў гэты прэстыжны статус не ў чаргу, бо Культурнай сталіцай СНД ужо быў Гомель? Намеснік выканаўчага дырэктара Міжнароднага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД Эльвіра Доля на гэта адказала: людзі галасуюць за тое, што ведаюць. Памяць пра ролю, якую Беларусь адыгрывала ў Савецкім Саюзе, яе сённяшні прэстыж у Садружнасці і паўплывалі на тое, што Магілёў "не ў чаргу" стаў Культурнай сталіцай СНД. А міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алег Праляскоўскі дадаў, што ў Садружнасці ведаюць: справа, даручаная беларусам, будзе зроблена якасна. І гэта таксама было аргументам на карысць Магілёва.

Старшыня Магілёўскага гарвыканкама Станіслаў Барадаўка, згадаўшы культурныя дасягненні магіляўчан, выказаў упэўненасць у тым, што духоўны чыннік пазітыўна адаб'ецца на і побытавай сферы, і на эканоміцы горада ды вобласці. А народны артыст Малдовы Яўген Дога, адзначыў, што людзей на абсягах былога СССР сёння аб'ядноўвае найперш культурная субстанцыя. На ягоную думку, статус для Магілёва — добры знак і добрая магчымасць звяртацца па дадатковую падтрымку культуры як да Урада сваёй краіны, так і да каардынацыйных органаў СНД: "Я часта чую, літаральна ўсё жыццё: маўляў, таго не хапае, гэтага… Сёння гэта ўжо не аргумент. Тое, што чагосьці не стае, каб зрабіць справу якасна, — гэта як печ, ад якой мы ўвесь час танчым. А давайце танчыць ад іншай "печы" — давайце дбаць пра духоўнасць". Маэстра — за тое, каб не шкадаваць на культуру грошай, бо ад яе карысць — усяму грамадству.

У Магілёве на свяце прысутнічала народная артыстка Казахстана Роза Рымбаева. Яна лічыць неабходным спрыяць праекту "Культурныя сталіцы Садружнасці", бо ён дае магчымасць распавесці новаму пакаленню ў зразумелай форме пра нашу агульную гісторыю, пра тое, што яднае народы на велізарнай прасторы СНД.

Намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Тадэуш Стружэцкі бачыць асноўны сэнс праектаў культурных сталіц Беларусі і СНД у тым, каб усе грамадзяне краіны, а не толькі жыхары адміністрацыйнай сталіцы мелі магчымасць пазнаёміцца з лепшым, што ёсць у нашай культуры і ў культуры суседзяў. Тадэуш Іванавіч не сумняваецца, што Магілёў з гонарам выканае высокую місію.

На прэс-канферэнцыі, а потым і ўласна на ўрачыстай імпрэзе была агучана тэза, што Магілёў тройчы ўганараваны сталічным статусам: ён — сталіца Прыдняпроўя, Культурная сталіца Беларусі і Культурная сталіца Садружнасці. Тое, што магіляўчане вартыя гэтага гонару, мелі давесці выстаўка эканамічных дасягненняў, разгорнутая ў фае абласнога Палаца культуры, а затым і дзея, што адбылася на яго сцэне. Мясцовыя артысты прадставілі гледачам карціны з гісторыі Магілёва. Грамада цёпла вітала сваіх творцаў, а таксама — артыстаў з Арменіі, Азербайджана, Малдовы, Украіны, Расіі. Варта адзначыць якасную рэжысуру сцэны. Для кожнага выканаўцы на плазменным экране былі падабраны дынамічныя выявы, што адпавядалі зместу і духу выступлення. Я меў магчымасць пабачыць не адзін музычны фестываль і магу канстатаваць: такая сінхроннасць здараецца не часта.

Розныя культурныя іпастасі горада выяўлены ў паэтычных дэвізах мерапрыемстваў, што будуць адбывацца тут цягам года: "Радзімы нашай скарб", "Духоўнай шчырасці імгненне", "З крыніц адвечнай прыгажосці", "Рэальнасць у пражэктарах ілюзіі" і гэтак далей. Усяго ж плануецца больш за тры тысячы культурных мерапрыемстваў.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ, наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Магілёў — Мінск
Фота аўтара

Алімпійскае золата — музейны экспанат

У пачатку наступнага тыдня новымі каштоўнымі прадметамі папоўняцца выставачныя залы Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці.

У прыватнасці, як адзначыў выконваючы абавязкі загадчыка ўстановы Сяргей Ісаковіч, шырокай грамадскасці будуць прадстаўлены чатыры прадметы, якія характарызуюць поспехі айчыннага спорту.

Так, на дэпазіт у Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці трапіў першы ў гісторыі суверэннай Рэспублікі Беларусь сярэбраны алімпійскі медаль, які заваяваў чэмпіён свету, біятланіст Аляксандр Папоў на XVI Зімовых алімпійскіх гульнях 1992 года ў французскім Альбервілі ў складзе эстафетнай каманды Аб'яднанай каманды краін былога Савецкага Саюза. Не менш сімвалічны для беларускага спорту і залаты медаль нашага параалімпійца Ігара Бокія, які стаў на спаборніцтвах у 2012-м у Лондане пяціразовым чэмпіёнам Параалімпіяды.

Ужо ў панядзелак у адной з залаў Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці можна будзе ўбачыць і Кубак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які штогод ўручаецца пераможцу Адкрытага чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па хакеі, а таксама парадны мужчынскі касцюм спартсменаў беларускай дэлегацыі на Алімпійскіх гульнях 2010 года ў канадскім Ванкуверы.

Варта адзначыць, што Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці, які адкрыўся летась, 22 чэрвеня, за паўгода наведала каля дзвюх тысяч чалавек. Сёння экспазіцыя музея налічвае каля 800 прадметаў і спалучае ў сабе новыя метады падачы музейных прадметаў і самыя сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі XXI стагоддзя.

Сустрэча з ветэранамі

Фота Юрыя ІВАНОВА

Міністр культуры Барыс Святлоў сустрэўся з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны — былым першым намеснікам міністра культуры Аляксандрам Ульяновічам (злева) і колішнім вядучым інжынерам Галоўрампрам забеспячэння Георгіем Лазычэнкам.

Быхаў рыхтуецца да Дня пісьменства

У Быхаве, які вызначаны сёлетняй сталіцай Дня беларускага пісьменства, пачалася падрыхтоўка да правядзення гэтай маштабнай рэспубліканскай акцыі. У рамках апошняй адбудуцца работы як па добраўпарадкаванні гарадской тэрыторыі, так і па рамонце шэрагу аб'ектаў сацыякультурнай сферы.

Як паведамляе з Быхава наш спецыяльны карэспандэнт Яўген Рагін, які выехаў туды ў камандзіроўку, з панядзелка будаўнікі зоймуцца рамонтам Быхаўскага раённага цэнтра культуры. Напачатку ў гэтай установе будзе даведзена да ладу спартыўная зала. На аб'екце запланавана задзейнічаць рабочых з Магілёўскага філіяла будаўнічай арганізацыі "Лаўсанбуд".

Пасля завяршэння рамонту ў РЦК работы распачнуцца ў мясцовым кінатэатры "Радзіма". Не забудуцца і на некалькі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны райцэнтра — мясцовыя замак і сінагогу, на якіх таксама плануецца шэраг рамонтна-аднаўленчых работ.

Да Дня пісьменства пройдуць яшчэ і пярэбары мясцовага Гісторыка-краязнаўчага музея на новае месца жыхарства. Ён размесціцца ў рэканструяваным старадаўнім будынку былой Быхаўскай гімназіі.

Падрабязна аб працэсе падрыхтоўкі райцэнтра да свята — у наступным з бліжэйшых нумароў газеты.

З Віцебска ў Парыж

21 лютага ў Люксембургскім музеі, што ў Парыжы, адкрылася выстаўка твораў Марка Шагала пад назвай "Паміж вайной і мірам".

Экспазіцыя паклікана данесці гледачу асноўную думку мастака: духоўнасць чалавека і яго рэлігійнасць з'яўляюцца галоўнымі шляхамі да міру і гармоніі між людзьмі.

На выстаўцы асабліва шырока прадстаўлены работы майстра, звязаныя з віцебскай тэматыкай, сярод якіх — "Чалавек-певень" (1925 г.), "Над Віцебскам" (1915 — 1920 гг.) і некаторыя іншыя.

У цырымоніі адкрыцця экспазіцыі прыняў удзел Пасол Беларусі ў Францыі Павел Латушка. Пад час мерапрыемства адбылася сустрэча Пасла з унучкай Марка Шагала — Мерэ Мейер-Грабер. У размове яна падкрэсліла, што заўжды з вялікім замілаваннем наведвае радзіму дзеда — горад Віцебск. Суразмоўца адзначыла, што Віцебск заўсёды з'яўляўся для Майстра каштоўнасцю, якую ён насіў з сабой, і ў кожнай кропцы свету, дзе б ён ні знаходзіўся, родны горад заўсёды быў для Марка Шагала крыніцай натхнення…

Павел Латушка і Мерэ Мейер-Грабер дамовіліся аб сустрэчы ў Пасольстве Беларусі ў Парыжы ў самы бліжэйшы час.

Кіраўнік дыпмісіі правёў таксама размову з прэзідэнтам Асацыяцыі нацыянальных музеяў Францыі Жанам-Полем Клюззлем, які ў гутарцы адзначыў, што на выстаўцы асаблівы акцэнт зроблены на творах Марка Шагала віцебскай тэматыкі.

З нагоды адкрыцця экспазіцыі вядучая французская газета "Le Figaro" надрукавала артыкул, дзе асабліва адзначыла значны ўклад Марка Шагала ў сусветную скарбніцу культуры. Французскае выданне падкрэсліла, што Шагал нарадзіўся ў Віцебску на Беларусі. У артыкуле адзначаецца, што ў 1910 годзе ён вучыўся ў Парыжы ў былога знакамітага мастака, ураджэнца Беларусі Льва Бакста.

Выстаўка работ Марка Шагала ў Люксембургскім музеі працуе да 21 ліпеня.

На здымку: Люксембургскі палац у Парыжы.

Музей Пэна: ёсць канцэпцыя

У бліжэйшыя гады ў Віцебску мае з'явіцца Музей Юрыя (Юдаля) Пэна. Пра гэта карэспандэнту "К" паведаміла загадчык філіяла "Мастацкі музей" Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Вольга Акуневіч. "Прынята рашэнне аблвыканкама аб яго стварэнні, — зазначыла яна, — і сёння ідзе праца над ягонай канцэпцыяй". Скарыстаўшыся магчымасцю пад час камандзіроўкі ў Віцебск, наш карэспандэнт распытаў кіраўніка распрацоўкі канцэпцыі будучай музейнай установы пра абрысы новага праекта.

З гісторыі

Нагадаем, што сёння самай вялікай музейнай калекцыяй знакамітага настаўніка Марка Шагала — 183 работы — валодае менавіта Віцебскі мастацкі музей. "Увесь фонд мастака ў нашай установе налічвае 370 адзінак захоўвання: гэта не толькі яго жывапісныя і графічныя творы, але і дакументы, мноства фатаграфій", — удакладняе Вольга Акуневіч. І гаворка пра стварэнне асобнага музея ўзнікла далёка не ўчора: Віцебску даўно ёсць што паказаць ды распавесці пра вядомую мастацкую постаць.

Увогуле, першапачаткова калекцыя знакамітага мастака была значна большая, адзначыла спецыяліст. Пасля яго сыходу ў 1937 годзе ў спадчыну віцебскага музея перайшло каля 800 яго работ. Захаваўся будынак, дзе месцілася майстэрня Майстра, і ў 1939 там была адкрыта карцінная галерэя Пэна, дзе гледачы маглі пазнаёміцца з ягонымі творамі.

Але вайна ўнесла свае карэктывы ў лёс карціннай галерэі. Частка спадчыны Пэна ў пачатку Вялікай Айчыннай была эвакуіравана ў Саратаўскую карцінную галерэю. Астатняе — а гэта каля 600 работ — згубілася пры нявызначаных абставінах. Штосьці было знішчана, штосьці — перапрададзена, а штосьці, па адной з існуючых версій, — нават вывезена ў Аўстрыю. Як бы там ні было, але з вялізнай калекцыі засталася толькі чацвёртая яе частка — каля 200 твораў, якія вярнуліся з эвакуацыі з Саратава.

"Прыгоды" спадчыны Майстра і на гэтым не скончыліся. У 1946 годзе, адным з першых рашэнняў улад, зазначае Вольга Акуневіч, было рашэнне аб адраджэнні карціннай галерэі Пэна. Але ўжо ў 1947-м калекцыя зноў пераязджае — у Мінск, у Дзяржаўную карцінную галерэю БССР (з 1957-га — Дзяржаўны мастацкі музей БССР). Там яна знаходзіцца ажно да 1992 года, і толькі дзякуючы Мікалаю Пагараноўскаму, які быў галоўным захавальнікам галерэі, вяртаецца ў Віцебск, дзе ў тым жа 1992-м "атрымлівае прапіску" ў Мастацкім музеі горада.

— Цяпер вы разумееце, якім унікальным скарбам мы валодаем, і чаму для нас так важна, каб работы мастака атрымалі належнае атачэнне, — падкрэсліла Вольга Іванаўна.

На жаль, на сёння мемарыяльны будынак на былой вуліцы Гогалеўскай, 1, дзе месцілася майстэрня Пэна, не захаваўся. Але пад будучы музей плануецца аддаць пабудову "з гісторыяй" — будынак па вуліцы Калініна, у якім на пачатку XX стагоддзя знаходзілася яўрэйская пачатковая школа. Што ж у ім будзе?

Праект канцэпцыі, над якім працаваў калектыў Мастацкага музея на чале з Вольгай Акуневіч, прапаноўвае наступныя акцэнты.

Акцэнты канцэпцыі

— У першай зале музея, — распавядае загадчык філіяла, — мы хочам арыентаваць наведвальніка на ўспрыняцце Пэна як з'явы, феномена праз прызму гістарычнай ацэнкі, прадставіць яго ролю не толькі ў мастацтве Беларусі, але і ягоны ўплыў на развіццё сусветнага мастацкага працэсу. Калі задумацца: не прыйшоў бы ў яго школу Марк Шагал — ці стаў бы ён мастаком, ці ўзнікла б потым Мастацкае вучылішча, якое прыцягнула Малевіча, Лісіцкага, Ермалаеву ды іншых, і, увогуле, ці з'явіўся б феномен Віцебскай мастацкай школы? Мы можам разважаць у гэтых катэгорыях. У гэтай частцы музея мае быць адлюстраваны вобраз Пэна — мастака, чалавека, педагога, які адкрыў свету шэраг іншых знакавых асоб. Пакуль пытанне, хто з мастакоў здолеў бы стварыць такую вобразную карціну-прэзентацыю. Важнае месца зойму́ць і выказванні вучняў пра свайго настаўніка.

Другая зала, — працягвае распавядаць спецыяліст, — мае пазнаёміць наведвальнікаў з біяграфіяй мастака. Тут "чырвонай лініяй" праз экспазіцыю праходзіць тэма "Віцебск у жыцці і творчасці Пэна". Атачэнне, у якім працаваў Юрый Майсеевіч, сам горад, якому ён прысвяціў сорак два гады свайго жыцця, — усё будзе пададзена праз адмысловыя прадметы, афармленне экспазіцыі. І такім шляхам, паступова, мы ўвойдзем у трэці блок, які ўжо будзе прадстаўляць знакамітую пэнаўскую школу-студыю. Атмасфера яго майстэрні мае быць адноўлена музейна-вобразнымі сродкамі. Але, зноў-такі, вельмі важным у дадзеным блоку стане крэатыўны падыход мастака, які створыць рашэнне экспазіцыі. Мемарыяльных матэрыялаў захаваліся, лічы, адзінкі, таму тут хацелася б прыдумаць і ўвесці арыгінальны вобраз. Вядома, што ў зале будуць прадстаўлены фатаграфіі яго вучняў, іх партрэты, зробленыя рукой мастака, успаміны пра школу-студыю, якія захаваліся ў Шагала, Заіра Азгура… Але ж без яскравага візуальнага вобразнага акцэнту не абысціся.

І трэці блок, — завяршае Вольга Іванаўна, — уласна, галерэя Юрыя Пэна на другім паверсе будынка. Тут мы размесцім яго работы па жанрах: напрыклад, "Пейзаж у творчасці Пэна", фігуратыўныя карціны, графічныя творы, партрэты… Апошнія, дарэчы, можна прадставіць некалькімі блокамі: Юрый Майсеевіч маляваў партрэты як у атачэнні — той жа "Гадзіншчык", так і іх класічныя ўзоры — мужчынскія, жаночыя, партрэты старых людзей, якія параўноўвалі са старымі Рэмбранта…

Канцэпцыя Музея Пэна ўтрымлівае і стварэнне адмысловай бібліятэкі, удакладніла кіраўнік яе распрацоўкі.

— Гэты музей будзе ўнікальны, — кажа Вольга Акуневіч, — бо экспазіцыя такой тэматыкі не мае аналагаў ва ўсім свеце…

Нягледзячы на тое, што будучы Музей Юрыя Пэна стане той самай галоўнай установай, дзе будуць захоўвацца ды прэзентавацца творы прабацькі віцебскай школы, мясцовы Мастацкі музей пакіне невялікую калекцыю і ў сваім будынку, які сёлета святкуе 130-годдзе.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Віцебск — Мінск
На здымках: зала твораў Пэна ў Мастацкім музеі Віцебска.

Дзяжурны па нумары

Не чакаць адкрыццяў збоку. Хоць паспрабаваць…

Магчыма, для кагосьці тое зусім не падзея: днямі Мінск наведаў Ігар Лебедзеў — фатограф, педагог Дзяржаўнага музейна-выставачнага цэнтра "РОСФОТО", куратар выставак, гісторык. Наведаў ён сталіцу з прыемнай, здавалася б, мэтай: пазнаёміцца з беларускімі фатографамі ды іх творчасцю. На дадзены момант Цэнтр, заснаваны Міністэрствам культуры суседняй краіны, які прадстаўляе Ігар Лебедзеў, фарміруе калекцыю беларускай фатаграфіі, і цалкам лагічна, што спецыяліст прыехаў да нас з жаданнем бліжэй пазнаёміцца з беларускім фатаграфічным асяродкам ды калекцыямі, серыямі, знакавымі творамі нашых аўтараў.

Не буду казаць пра тое, ці ўдалося Ігару Валер'евічу заахвоціць кагосьці падарыць ягонай інстытуцыі свае здымкі. Усё ж такі быць у калекцыі "РОСФОТА" — прэстыжна. Гэта, урэшце, не прадмет для сённяшняй рэплікі. Засмуціла іншае. Напэўна, расійскі эксперт — далёка не першы, хто цікавіцца феноменам беларускай фатаграфіі, ды, спадзяюся, не апошні. Цікавасць да айчынных аўтараў чамусьці адчуваецца ў нас усё больш з-за мяжы, але не з нацыянальных нашых акадэмій, музеяў, галерэй, агенцтваў, бібліятэк. І чамусьці гэтая дзіўная тэндэнцыя нікога не засмучае.

Вядома, што на маю прэтэнзію адразу "пасыплецца" дождж надзённых пытанняў: маўляў, а ці маем мы, творцы, або тыя ж музеі, грошы на закупку калекцый фатаграфій? Ці ёсць чалавек у айчынных установах, які прафесійна займаецца "гэтай самай" фатаграфіяй? Ды, увогуле, а "ці ёсць хлопчык?" А мо ў нас няма і той фатаграфіі, якую неабходна купіць ці нават проста злачынна не купіць у нацыянальныя фонды?

Сказаць па шчырасці, гэтыя "надзённасці", пры ўсёй іх рацыянальнасці, для мяне не адыгрываюць вядучай ролі — асэнсаванне каштоўнасці фатаграфіі як дакумента гісторыі (няхай сабе і суб'ектыўнага), як твора мастацтва. Ці мае для нас значэнне "зрокавая памяць" пакаленняў беларусаў? Хіба не цікавыя для нас візуальныя пошукі яшчэ тых фатографаў-аматараў, пачынальнікаў фатаграфічнага руху на Беларусі, а, у рэшце рэшт, як сведчыць гісторыя, заснавальнікаў нацыянальнай школы фатаграфіі? Увогуле, ці разумеем мы, што нам можа даць і дае зусім маладое, па гістарычных мерках, мастацтва фатаграфіі?

Вось на гэтыя пытанні, у першую чаргу, трэба даць адказы, і тады тыя "надзённыя" — вырашацца "ў рабочым парадку".

Пакуль жа фатографа і эксперта фатаграфіі Ігара Лебедзева не засмучаюць усе тыя "але": ён бачыць у нашым, хочацца сказаць, "белфота" каштоўнасць, адметнасць, ды, вядома, патэнцыял. Яго прыклад — не адзінкавы.

Толькі на мінулым тыдні я вярнулася з Віцебска, дзе мне ўдалося сустрэцца з адным з удзельнікаў фотаклуба "Віцебск" Міхаілам Шмерлінгам. Так, у Віцебску існаваў свой фотаклуб, які, на жаль, сышоў у нябыт у 1990-я. Размаўлялі без перапынку дзве гадзіны. І Міхаіл Маркавіч паказваў старыя каталогі з выставак, брашуры, выразкі з газет. Выпадкова трапляецца адна з іх пад назвай "Падарыў выстаўку музею". "А хто гэта падарыў?" — рэагую. "Я, — адказвае Шмерлінг, — аднаму польскаму музею". І, нібыта саромеючыся, дадае: "Музей мне зладзіў шыкоўную выстаўку. Вельмі цёпла прымаў. Я не мог быць няўдзячным…"

Дык вось, можа, пачынаць трэба акурат з гэтага: любіць сваё, любіць сваіх? Не ставіцца да ўласных аўтараў як да вандроўных летуценнікаў, а даваць ім шанц выявіць сябе? Не чакаць, калі хтосьці збоку адкрые іх для нас, а — рабіць гэта самім. Хоць паспрабаваць. І хутчэй збіраць іх арыгінальныя творы (надрукаваныя на паперы і па тэхналогіі, адпаведнай свайму часу) ў нацыянальныя музеі ды архівы, пакуль іншыя — няхай і паважаныя, замежныя эксперты — не зрабілі гэта за нас. Толькі для сваіх фондаў.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Брэсцкая крэпасць: новыя далягляды

Як вядома, мемарыяльны комплекс займае толькі частку тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. Значны абшар фартыфікацыйнай сістэмы не задзейнічаны ні пад гаспадарчыя патрэбы, ні пад турыстычны маршрут. Зараз гэтая сітуацыя выпраўляецца.

Днямі ў Брэсце адкрыўся новы мост праз Буг, і да гэтай падзеі была прымеркавана першая экскурсія на Пагранічную выспу, што знаходзіцца за Цярэспальскай брамай.

Уласна кажучы, трапіць на гэтую выспу можна было і раней (праўда, па прапусках: усё ж такі побач — дзяржаўная мяжа), а вось экскурсій па ёй не ладзілася. Першымі з новым турыстычным аб'ектам азнаёміліся прадстаўнікі ўлады, дыпламаты і журналісты. Для гасцей зладзілі тэатралізаваную дзею: яны нібыта акунуліся ў час паміж вераснем 1939-га і чэрвенем 1941 года. На іх вачах рыхтаваліся і маршыравалі чырвонаармейцы, якім было наканавана прыняць першы бой Вялікай Айчыннай. Такая ці падобная да яе гістарычная рэканструкцыя можа стаць часткай турыстычнага сцэнарыя, уключанага ў пастаянны маршрут.

Дырэктар мемарыялу Рыгор Быскок выказаў надзею, што ў перспектыве так яно і будзе. Ужо ідзе гаворка і пра аднаўленне моста з Брэсцкай крэпасці, з беларускага боку, на польскую тэрыторыю. Дзякуючы гэтаму наведвальнікаў у Цытадэлі стане яшчэ больш.

Сёння да стварэння на ўсёй тэрыторыі Брэсцкай крэпасці гісторыка-культурнага комплексу далучыліся інвестары "цяжкай вагавой катэгорыі", а таксама камерцыйныя структуры. Над будучым абліччам крэпасці працуюць чатыры групы архітэктараў.

Беларусы ў Вільнюсе

Больш за 500 беларускіх кніг прадстаўлена на XIV Вільнюскім міжнародным кніжным кірмашы, які праходзіць з 21 па 24 лютага ў выставачным цэнтры "LitEXPO".

Выдавецтва "Мастацкая літаратура" адправіла ў Вільнюс "Зачараваную гаспадарку" Пятра Сіняўскага, "Мячы Грунвальда" Анатоля Бензерука, кнігі "Якуб Колас і легендарны дзед Талаш" Міколы Жыгоцкага, "Пан Тадэвуш" Адама Міцкевіча ды многія іншыя.

"Пачатковая школа" прадставіць на кірмашы выданні з літаратурнага праекта "Гарады і гістарычныя мясціны Беларусі". А выдавецтва "Адукацыя і выхаванне" — цэлую серыю, прысвечаную беларускім народным традыцыям.

Несумненна, прыцягнула ўвагу прэзентацыя выдання "Беларусы ў фотаздымках Ісака Сербава. 1911 — 1912", што адбылася 22 лютага ў бібліятэцы Вільнюскага ўніверсітэта. Арганізатарамі імпрэзы выступілі выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі", Пасольства Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы і бібліятэка ўніверсітэта.

Акрамя прэзентацый найноўшых выданняў і сустрэч з калегамі, айчынныя выдаўцы напрыканцы кірмашу зробяць традыцыйны "кніжны падарунак" беларускай школе імя Францыска Скарыны ў Вільнюсе: сёлета вучэбнай установе будзе падорана каля 200 кніг.

Надзея ПЯКАРСКАЯ,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ

НАГАДВАЕМ!
ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" НА САКАВІК І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ І-ГА ПАЎГОДДЗЯ 2013 г.
Падпісныя індэксы:
індывідуальная падпіска — 63875,
ведамасная падпіска — 638752.

Тыдзень таму ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры былі падведзены вынікі конкурсу на стварэнне нацыянальнага спектакля. Вынікі аказаліся... безвыніковымі, таму лепш назавём іх папярэднімі. Паводле афіцыйнай інфармацыі, было даслана больш за 15 работ. У фінал выйшлі чатыры, але што з гэтага тэатр будзе ставіць, пакуль незразумела. Найперш — для самога тэатра.

"Пад ключ" не атрымалася: "айсбергі" для "Ладдзі Роспачы" і "Лятучага Галандца"

Чаму ў конкурсе на нацыянальны мюзікл перамог... Уладзімір Караткевіч?

Лічбы: а ці быў хлопчык... прабачце, конкурс?

Што ж, станем прытрымлівацца філасофіі, што любы вынік — станоўчы. Ужо хаця б таму, што дапамагае ўбачыць памылкі і пралікі, прааналізаваўшы якія, можна больш хутка ды паспяхова рухацца наперад. Застаецца толькі, адкінуўшы эмоцыі конкурсных баталій, спакойна асэнсаваць тое, што атрымалася — ці, можа, не.

Тут давядзецца канстатаваць, што заяўленая вышэй лічба твораў-канкурэнтаў насамрэч куды меншая. Па-першае, толькі ў дзвюх з дасланых работ конкурсныя ўмовы былі цалкам выкананы: быў прадстаўлены завершаны твор. Па-другое, даведаўшыся пра конкурс, аўтары не кінуліся хутчэй пісаць новыя творы, якія адпавядалі б яго ўмовам, а проста паглядзелі, што можна дастаць са сваіх куфраў. Адзінай завершанай работай, ужо па тэрмінах створанай акурат да гэтага конкурсу, стала драматычная фантазія Сяргея Бельцюкова "Лятучы Галандзец" на лібрэта Навума Гальпяровіча паводле аднайменнага аповеду У.Караткевіча. Але нават гэты твор, шмат у чым заснаваны на прынцыпах радыёдраматургіі, у сваім патэнцыяле мае падсвядомы "шлях да адступлення": маўляў, калі тэатр гэтую партытуру не возьме, яна без аніякіх пераробак будзе не толькі прыдатная для радыёэфіру, але і зможа папраўдзе яго ўпрыгожыць. Ці ж гэта не сімптом нейкіх недапрацовак у самой арганізацыі спаборніцтва? Высокапрафесійныя, знаныя творцы апрыёры не маглі рызыкаваць, бо не мелі гарантый на пастаноўку. Мне запярэчаць: маўляў, ці маюць яны тыя гарантыі, калі пішуць буйны твор самі? Вядома, не. Але імі рухае натхненне, якое, зразумела, не нараджаецца адначасова з аб'яўленнем конкурсных умоў.

Так што ў пэўным сэнсе конкурс, як яго разумеюць у цывілізаваным грамадстве, практычна… не адбыўся. Тое, што праходзіла ў тэатры, было больш падобна на агляд, калі можна так сказаць, прынесенага. Прычым, паўтаруся, часцей не створанага спецыяльна да конкурсу, а — так званых хатніх напрацовак. Ці, наадварот, накідаў, эскізаў. Куды ахвотней аўтары прыносілі не гатовы, цалкам падрыхтаваны да пастаноўкі мюзікл або аперэту, а хіба ўрыўкі магчымай музыкі. Ці проста лібрэта. Ці ўвогуле сінопсіс — сціслы змест. Тэатр жа марыў атрымаць "аб'ект", што называецца, "здадзены пад ключ". Таму ўключыў у спіс конкурсных таксама тыя творчыя заяўкі, што былі прапанаваны новаму кіраўніцтву літаральна ад самога пачатку ўступлення апошняга на пасады. Некаторыя з тых колішніх аўтараў нават не падазравалі, што аказаліся "канкурсантамі". І, паводле іх слоў, даведаліся пра гэта (а некаторыя — і пра ўвесь конкурс, дзе паспелі "паўдзельнічаць") з маіх тэлефанаванняў, калі я спрабавала скласці рэальную карціну таго, што ёсць сёння ў арсенале нашых творцаў.

Але кінем займацца арыфметыкай. Куды важней ноты ды літары, якія стаяць за гэтымі лічбамі. Што ж прынеслі ў тэатр літаратары? А што — кампазітары? Паспрабуем разгледзець гэтыя два складнікі паасобку, бо "суладдзя" паміж імі часцей за ўсё не назіралася. Ёсць меладычнасць — няма "закручанасці" сюжэта. Ёсць прыдатныя размоўныя дыялогі — няма вакальных нумароў, бо не напісаны пакуль да іх вершы. А здаралася і так, быццам суладдзе ёсць, ды толькі — тэатралізаванасці бракуе.

Літары: чытаць — можна, а ставіць?

У літаратурнай частцы конкурсу "перамог", безумоўна, Уладзімір Караткевіч: да ягоных твораў аўтары звярнуліся ажно ў чатырох выпадках, абраўшы "Дзікае паляванне караля Стаха", "Лятучага Галандца" і, двойчы, "Ладдзю Роспачы". Можна, канешне, парадавацца за нашага класіка і прызнанне яго творчасці. Але ж ці не падстава гэта для роздуму, калі з усёй нацыянальнай літаратуры абіраецца толькі адно імя?..

Прааналізаваўшы матэрыялы, я з жахам пераканалася, што некаторыя аўтары разумеюць пад сінопсісам "школьны" пераказ сюжэта літаратурнага твора. А між тым, музычная драматургія мае свае асаблівасці, яна змяняе і характары герояў, і абставіны, у якіх яны дзейнічаюць, і, вядома, жанравыя абрысы.

Штосьці папраўдзе блізкае да музычнага мыслення можна было знайсці хіба ў сінопсісе Дзяніса Марціновіча паводле "Ладдзі Роспачы". Пачыналася ўсё з кірмашу — а гэта можа стаць яркай, каларытнай сцэнай, уласцівай ледзь не кожнаму музычнаму спектаклю: ёсць дзе паспяваць-патанчыць. Сустрэча Гервасія з Бярозкай была прадугледжана яшчэ ў першай дзеі, у рэальным жыцці. Пазней дзяўчына станавілася сведкай сустрэчы свайго каханага з каралевай Бонай. Адразу складаўся такі, упадабаны ў операх ды аперэтах, трохкутнік. Пасварыўшыся, закаханыя былі гатовы памерці ад нераздзеленых, як ім здавалася, пачуццяў — тут і падпільноўвала іх Смерць, што само па сабе з'яўляецца рэальным тлумачэннем зусім не фантасмагарычнага з'яўлення "бабулі з касой".

Магчымыя спробы "абараніць" Караткевіча ад падобных "перапрацовак" будуць марныя: вылучэнне на першы план не філасофскай асновы твора, а яго любоўнай лініі даўно ўжо стала ў музычным тэатры традыцыйным. Менавіта так, нагадаю, было і з "Фаўстам", і з "Яўгеніем Анегіным". Законы жанру!

На жаль, тыя ж праблемы "немузычнасці" былі і ў прадстаўленых лібрэта. У некаторых, што называецца, было няма дзе ўціснуць хоць якое-небудзь спеўнае ўкрапванне. Затое шчодра выкарыстоўвалася "музыка фонам", як у драмтэатры. З дыялогамі, а то і меладэкламацыяй, як у жанры меладрамы XVIII стагоддзя.

А гумар? У Музычным тэатры, ужо ў адпаведнасці са спецыфікай яго рэпертуару і самой публікі, без гумару цяжкавата. У прадстаўленых жа заяўках апошні, часцей за ўсё, адсутнічаў. Зразумела, у жанры мюзікла магчымы і трагедыі. Але хто сказаў, што хаця б нейкая доля жартаў, "прыколаў", трапных заўваг ці хаця б іроніі ім перашкодзіць? Можа, наадварот, усё гэта толькі падкрэсліць трагізм?

Адзіным выключэннем тут засталася "Камароўка, Камароўка…" Браніслава Сарманта і Барыса Жанчака. Дыялогі, за некаторым выключэннем, — проста цукерачка: іх можна "разабраць" на анекдоты і крылатыя выразы. Сама ідэя — супер! Камароўка — гэта, калі хочаце, своеасаблівы жартоўны імідж сталіцы, а менавіта на месцы цяперашняга кірмашу і плошчы Якуба Коласа адбываецца дзея. Суцэльны блок твора вяртае нас да "карцінак мінулага": перад вачыма праходзяць падзеі, што адбываліся (ці маглі б адбывацца) тут у мінулыя стагоддзі. Героі без цяжкасці "раскладаюцца" на класічную аперэту: дзве пары лірычных закаханых ("бацькі і дзеці"), дзве — характарных герояў рознага ўзросту (субрэтка і прастак). А вось з усім астатнім, уключаючы інтрыгу і асабліва фінал, — праблематычна. Але ж тэатру тут ёсць над чым падумаць, бо адмаўляцца ад такой папраўдзе "брэндавай" сталічнай ідэі было б неабачліва, хаця і папрацаваць давядзецца — удосталь.

Такім чынам, многія творы былі "асуджаны" ўжо на ўзроўні драматургіі, што можна было прадбачыць яшчэ да пачатку конкурсу. Яны ператвараліся то ў "канцэрт у касцюмах", складзены з адно экспазіцыйных нумароў, якія не рухаюць дзеянне, то ў пераказ сюжэта, нават са шматлікімі ўстаўкамі "ад аўтара", аддадзенымі "голасу за кадрам". Апошні прыём, дарэчы, набліжаў магчымае відовішча да вячэрняга радыёспектакля са спакойным, размераным аповедам: спачатку пра падзеі нам расказвае вядучы, потым многае з таго атрымлівае пацвярджэнне ў дыялогах з устаўнымі музычнымі нумарамі. Ідэальны варыянт для эфіру! Спачатку — сціслa "пра навіны". Потым — больш грунтоўна пра кожную з іх, з так званымі гаворачымі галовамі. І як "адбіўкі" паміж развіццём сюжэта — музыка. Усё папраўдзе скіравана на тое, каб сюжэтныя перыпетыі былі зразумелыя кожнаму, хто далучыцца да праграмы нават не з яе пачатку. Але ж для тэатра падобная драматургія наўрад ці будзе такой жа выйгрышнай: сучасны глядач прагне імклівага дзеяння.

Ноты: мелодыя ёсць, а рытмы і тэмпы...

Кампазітары, нагадаю, у большасці прынеслі ў тэатр тое, што ўжо было ў іх "партфелях". Мюзікл Ганны Казловай "Барбара NEW" на лібрэта Тацяны Сінькевіч гучаў у Беларускай дзяржаўнай філармоніі ў канцэртным выкананні, з запрашэннем нават оперных спевакоў. Раней, ажыццёўлены больш аматарскімі сіламі, ён паказваўся і ў тэатралізаваным выглядзе.

Прыносілі і незавершанае. Ці тое, што пачыналі пісаць "у нікуды", без праекцыі на пэўны тэатр ды рэальных выканаўцаў. Ці тое, што было прызначана для драмспектакляў, ды не скарыстана там цалкам. Так здарылася, да прыкладу, з абедзвюма "Ладдзямі…". Мелодыі Алега Чыркуна можна было пачуць у эксперыментальнай студэнцкай пастаноўцы, што аднойчы прэзентавалася ў фае Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Алегу Хадоску замаўлялі музыку да драматычнай пастаноўкі "Ладдзі…", што ўвасаблялася Ігарам Пятровым на леташнім Міжнародным форуме "ТэАрт". Але рэжысёр узяў толькі частку напісанага, далучыўшы таксама іншыя музычныя фрагменты.

Песенныя і інструментальныя нумары "Лятучага Галандца", прафесійна зробленыя Сяргеем Бельцюковым, цалкам адпавядаюць нетаропкай па тэмпарытме літаратурнай аснове і строга вытрымліваюць патрабаванні вячэрняга эфіру. Тут ёсць і жанравыя часткі, што дапамагаюць "абмаляваць" месца дзеяння і характары дзеючых асоб, і спакойная, ненадакучлівая музыка, якая спрацоўвае як "калыханка" для дарослых, паралельна дапамагаючы тым няспешна, але ў рытме займацца сваімі справамі і неўзабаве пераходзіць да сну.

Ні ў адной з прадстаўленых работ не было драйву, сучасных рытмаў, той шалёнай энергетыкі і самога пачуцця захаплення, якога мы так чакаем у мюзіклах і блізкіх да іх оперных жанрах з прыстаўкамі рок-, поп-, лайт-. Нават тэмпы былі, часцей за ўсё, павольныя, разважлівыя, нетаропкія: маўляў, менталітэт у нас такі. Дык усё ж сапраўды — менталітэт? Ці, можа, стос традыцый, якім, на думку нашых папярэднікаў, павінен быць беларускі нацыянальны спектакль? Але ж час змяніўся! І мы — таксама. Усё больш пачуваем сябе ў цэнтры Еўропы…

Вядома, мы пачулі далёка не ўсё, на што здольныя аўтары, якія прэзентавалі свае праекты. Але падкрэслю, што ў выніку конкурсу тэатр разлічваў на "цалкам гатовы прадукт", які трэба будзе хіба "перанесці" на сцэну. А яшчэ — на шырокае адкрыццё новых і прытым маладых імёнаў аўтараў. А галоўнае — на атрыманне адразу шэдэўраў. Прычым на выключна нацыянальную тэму, але каб гэта быў сусветны ўзровень. Ці хаця б — не ніжэй за летась паказаную екацерынбурскімі лайт-оперу "Мёртвыя душы" А.Пантыкіна, што атрымала безліч расійскіх тэатральных прэмій "Залатая маска".

Але ж так не бывае, каб адразу і цалкам! Свярдлоўскі тэатр музкамедыі не адзін год "гадаваў" ды песціў сваіх аўтараў, падтрымліваючы іх нават не самыя ўдалыя спробы. І мэтанакіравана замаўляў ім тое, што хацеў бы бачыць на сваёй сцэне. Чаму б і нам так не зрабіць? І ў тэатры, і на старонках "К" неаднойчы былі выкладзены прапановы правесці спачатку конкурс ідэй: пра што будзе спектакль. Потым — сінопсісаў на "зададзеную тэму". Нарэшце, можна замовіць лібрэта, якое адразу будзе стварацца з удзелам рэжысёра, каб яму потым штосьці не перарабляць. Хочаце адкрыць новыя кампазітарскія імёны? Выберыце з гатовага лібрэта два-тры рознахарактарныя, але важныя у драматургіі фрагменты — і аб'явіце конкурс на стварэнне да іх музыкі. А тады замаўляйце твор таму, хто вас больш задавольвае.

…Ужо пасля падвядзення вынікаў Ларыса Сімаковіч прынесла ў тэатр свой "Апокрыф" паводле М.Багдановіча. А "Люцыяна Таполю" паводле М.Танка — "пашкадавала". Затое прапанавала звярнуць увагу на дзве англамоўныя рок-оперы Яна Жанчака: з перакладам іх на беларускую мову праблем не паўстане. Так што ў тэатра ёсць час для роздуму. Тым больш, што ўлетку мае адбыцца даўно запланаваная прэм'ера пазаконкурснай "Соф'і Гальшанскай" Уладзіміра Кандрусевіча. А далей можна і не спяшацца?..

Надзея БУНЦЭВІЧ

Чатыры тэлефанаванні па адной праблеме

Літаральна днямі рэдактар аддзела нашай газеты Надзея Бунцэвіч збіралася пісаць чарговы артыкул новай рубрыкі "Art-blog: па-за Мінскам". Пасля Палескага драматычнага тэатра з Пінска "на чарзе" быў Мазырскі драмтэатр імя Івана Мележа. Але на выхадных гэтая ўстанова культуры сама нагадала пра сябе сумнай навіной, што ўвобмірг разляцелася па інтэрнэт-прасторы ды СМІ: у будынку тэатра здарыўся пажар. Карэспандэнт "К" паспрабаваў даведацца, што ж адбылося насамрэч, наколькі вялікі ўрон нанесены ўстанове культуры і як паўплывае гэты інцыдэнт на далейшую творчую дзейнасць мазырскіх артыстаў.

Ці адаб'ецца пажар у мазырскім тэатры на рэканструкцыі і працы трупы?

Пажар vs. рамонт

Тэлефанаванне першае

Прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь Руслан ГАБРЫЛЁЎ:

— Пажар у будынку Мазырскага драматычнага тэатра здарыўся 16 лютага. Паведамленне аб здарэнні паступіла ў мясцовы РАНС у 14.02, і на месца пажару адразу выехала некалькі пажарных разлікаў. А ўсяго на ліквідацыі агню працавала прыкладна дваццаць адзінак тэхнікі. Агонь быў патушаны ў 15.44. У выніку пажару пашкоджаны дах будынка, часткова абвалілася кроквенная сістэма. Таксама агнём знішчана ўнутраная аддзелка і маёмасць, што знаходзілася ў пакоях на другім паверсе тэатра. На сённяшні дзень Следчым камітэтам Рэспублікі Беларусь праводзіцца праверка па факце здарэння. Таму дакладна сказаць, адбыўся пажар з-за няспраўнай праводкі, так званага чалавечага фактара ці з якой-небудзь іншай прычыны, на сёння пакуль што яшчэ нельга. Дакладныя звесткі будуць атрыманы пасля заканчэння следча-аператыўных дзеянняў…

Тэлефанаванне другое

Начальнік аддзела культуры Мазырскага райвыканкама Гомельскай вобласці Ірына МІРОНЫЧАВА:

— Гэта, канешне ж, вельмі непрыемны выпадак. Але магу сказаць: на сёння амаль усе наступствы пажару ў Мазырскім драматычным тэатры ўжо ліквідаваны, тым больш, што агонь закрануў толькі памяшканні на другім паверсе. Мы, як вядома, планавалі сёлета зрабіць рэканструкцыю будынка, пабудаванага яшчэ ў 1933 годзе. У тэатры ўжо пачаліся падрыхтоўчыя работы, таму, напрыклад, вялікая сцэна, размешчаная на першым паверсе, намі ўжо не выкарыстоўвалася. Таксама яшчэ да пажару былі перавезены ў асобнае памяшканне тэатральныя дэкарацыі да дваццаці спектакляў. Так што нам удалося выйсці з гэтага надзвычайнага становішча, лічу, з мінімальнымі стратамі.

Летась аддзелам культуры была аплачана праектна-каштарысная дакументацыя для правядзення рэканструкцыі драмтэатра: пад гэтыя мэты пайшло звыш мільярда рублёў. Сёлета мы планавалі прыступіць да асноўных работ на гэтым аб'екце. Паводле Дзяржпраграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця і комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся на 2010 — 2015 гады мы ўжо атрымалі пад гэтыя мэты звыш 16 мільярдаў рублёў. Таму ўсе запланаваныя работы па рэканструкцыі будуць праведзены намі ў адпаведнасці з графікам.

Адміністрацыя і бухгалтэрыя тэатра цяпер размешчаны ў выставачнай зале, майстэрня — на базе іншых устаноў культуры райцэнтра, а для выступлення трупы будзем выкарыстоўваць наяўныя залы дамоў культуры Мазыра і сцэны Цэнтра цыркавога мастацтва "Арэна". Так што ўсе спектаклі будуць ісці ў звычайным рэжыме і жыхары райцэнтра без тэатральных пастановак не застануцца…

Тэлефанаванне трэцяе

Дырэктар Мазырскага драматычнага тэатра імя Івана Мележа Марыя ПАТАП'ЕВА:

— Зараз мы пераязджаем на новае месца жыхарства. Шмат што згарэла: касцюмы, дыскі з запісамі, мэбля і гэтак далей… Але дакладна сказаць пра тое, што і колькі мы страцілі пад час пажару, я на сённяшні дзень пакуль не магу: цяпер праводзіцца інвентарызацыя, і дакладную інфармацыю пра страты зможам атрымаць крыху пазней. Я ведаю пра тое, што "К" чакае ад нас запісы спектакляў. Таму будзем шукаць дыскі з запісамі нашых пастановак у іншых месцах: магчыма, у каго-небудзь з супрацоўнікаў засталіся копіі. Як знойдзем, абавязкова накіруем матэрыял у газету…

Тэлефанаванне чацвёртае

Намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама Вольга АНТОНЕНКА:

— Грашовыя сродкі ад нашага ўпраўлення ўжо накіраваны ў раёны. Таму дадатковага фінансавання на ліквідацыю наступстваў пажару ў Мазырскім драмтэатры не прадугледжана. Аддзел культуры мясцовага райвыканкама можа самастойна вырашыць, куды і на якія мэты накіраваць грошы, што ўжо паступілі з вобласці. Мы, натуральна, паспрабуем ім дапамагчы чым можам, прынамсі, тымі ж касцюмамі. Звернемся да іншых тэатраў вобласці, каб яны накіравалі які-небудзь рэквізіт для мазыран і аказалі такім чынам нейкую падтрымку сваім калегам. Спадзяюся, гэта сапраўды дапаможа калектыву з Мазыра, хаця б на першых парах…

■■■

Як бачна, наступствы надзвычайнай сітуацыі ў Мазыры паступова ліквідуюцца. Шчыра жадаем, каб праца калектыву ўвайшла ў сваё рэчышча як мага хутчэй. Але гэтае здарэнне яшчэ раз нагадала: пра пажарную бяспеку ва ўстановах культуры ніколі не варта забываць. Агонь, як вядома, бесклапотнасці не даруе…

І апошняе. У хуткім часе рэдакцыя газеты "Культура" звернецца больш падрабязна да тэмы пажарнай бяспекі, прааналізаваўшы выпадкі надзвычайных здарэнняў ва ўстановах культуры розных рэгіёнаў Беларусі. Бо тэма гэтая – заўсёды надзённая і актуальная.

Занатаваў Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ
Фота прадастаўлена Гомельскім абласным упраўленнем МНС

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах сённяшняга нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77 або на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** тэму на www.facebook.com/kimpressby, www.twitter.com/kultura_by

Сітуацыя

Сёння за межамі нашай краіны знаходзяцца не толькі мастацкія, кніжныя, ювелірныя рарытэты, створаныя рукамі нашых продкаў, але і архітэктурныя помнікі. Адзін з іх размешчаны на Пскоўшчыне. А літаральна днямі ў рэдакцыю "К" прыйшоў ліст з Санкт-Пецярбурга ад навуковага супрацоўніка Дзяржаўнага Эрмітажа, якому неабыякавы лёс унікальнага храма — узору беларускага драўлянага дойлідства.

Гіне помнік!

"Няхай фотаздымкі не ўводзяць у зман…"

"На поўдні Пскоўскай вобласці, у Невельскім раёне, гіне ўнікальны помнік беларускага драўлянага дойлідства XVIII — XIX стагоддзяў — царква ў гонар Пакрову Божай Маці ў вёсцы Стайкі. Гаворка ідзе пра апошнюю з дзясяткаў драўляных цэркваў, што існавалі ў гэтай частцы былой Віцебскай губерні. Па заключэнні, якое дала доктар мастацтвазнаўства, вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Тамара Габрусь, "… Пакроўская царква ў Стайках з'яўляецца помнікам архітэктуры канца XVIII стагоддзя ў стылі барочнага класіцызму. Яна пабудавана як уніяцкая, але, відавочна, ужо пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і далучэння гэтага краю да Расійскай імперыі, хутчэй за ўсё, у 1780 — 1790-х гг. Па сваёй кампазіцыі царква адносіцца да распаўсюджанага ў Беларусі тыпу трохзрубных храмаў так званай базілічнай канцэпцыі. Уваходны аб'ём уключае бабінец, свячную, хрысцільню, а наверсе — "хоры музычныя", нехарактэрныя для праваслаўных цэркваў. Сіметрычныя васьмерыкі нагадваюць дзвюхвежавыя фасады касцёлаў. У дэкоры выкарыстаны спараваныя выцягнутыя пілястры, характэрныя для позняга барока. Помнік — вельмі цікавы, адначасова тыповы і незвычайны". Сапраўды, у дакументах 1776 — 1822 гг. царква згадваецца як грэка-каталіцкая.

У калекцыі Невельскага музея захаваліся здымкі храма, зробленыя ў 1993 г. знаўцам пскоўскіх помнікаў Б.Скабельцыным. Але яны не павінны ўводзіць у зман. Вось ужо некалькі гадоў як будынак стаіць без даху… Царква ў літаральным сэнсе знаходзіцца на мяжы знікнення. Каб яе выратаваць, патрабуюцца неадкладныя кансервацыйныя меры (хаця б уладкаванне часовага даху), а затым і добра прадуманыя аднаўленчыя работы. Тым больш, кваліфікаваныя архітэктары-рэстаўратары ў Расіі яшчэ маюцца. Але, на жаль, адсутнічае фінансаванне. З 1999 г. у Стайках існуе невялікая праваслаўная абшчына, але грошай на аднаўленне храма ў яе няма. Абыякава да лёсу храма ставіцца кіраўніцтва Пскоўскай епархіі, тым больш, што ў вобласці стаяць у руінах дзясяткі сельскіх цэркваў (праўда, цагляных, а не драўляных).

Нягледзячы на сур'ёзную зацікаўленасць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў г. Мінску, надзея ўключыць помнік у адну з сумесных праграм Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі не спраўдзілася: з той простай прычыны, што, паводле афіцыйнага адказу расійскага Міністэрства культуры, апошняе не можа выступіць у ролі заказчыка работ…

…Адзінае, на што застаецца разлічваць, — гэта дапамога валанцёраў і спонсараў, усіх, каму неабыякавы лёс беларускай культурнай і духоўнай спадчыны…

Аляксандр ГОРДЗІН,
навуковы супрацоўнік
Дзяржаўнага Эрмітажа
Санкт-Пецярбург
Расія"

Каментарый з нагоды

Што за будучыня чакае гэты ўнікальны ўзор беларускага драўлянага дойлідства? "К" вырашыла пацікавіцца, якія меркаванні на гэты конт маюць Міністэрства культуры нашай краіны і Прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску.

Па словах Аксаны Сматрэнка, намесніка начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры нашай краіны, ніякіх запытаў аб дапамозе альбо сумеснай працы на аб'екце пакуль не паступала. А, адпаведна, без іх казаць пра канкрэтныя захады па выратаванні аб'екта не даводзіцца.

Як адзначыў кіраўнік Прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Міхаіл Орда, для Саюзнай дзяржавы вельмі важна захаваць гэты ўнікальны помнік. Літаральна два тыдні таму было падпісана і накіравана губернатару Пскоўскай вобласці Андрэю Турчаку адпаведнае хадайніцтва. Па словах Міхаіла Орды, з-за таго, што помнік архітэктуры знаходзіцца на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, то і ініцыятарам яго рэстаўрацыі павінен выступіць расійскі бок. Мінскае Прадстаўніцтва Пастаяннага Камітэта, як заверыў яго кіраўнік, у сваю чаргу, гатова аказаць пасільную падтрымку праекту.

Распытваў Кастусь АНТАНОВІЧ

Пабываць ва ўсіх кутках!

— Канцэртаў у нас заўсёды шмат, — гаворыць заслужаны артыст Беларусі, палкоўнік Уладзімір ВАРАПАЕЎ, начальнік — мастацкі кіраўнік Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, — а напярэдадні свята — яшчэ больш, літаральна штодзень. Тут і Рэспубліканскі шпіталь інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ў Бараўлянах, і Рэспубліканскі інтэрнат ветэранаў вайны і працы ў Ждановічах. Усяго за год бывае больш як 150 выступленняў. Ездзім, вядома, па ўсёй Беларусі. Са студзеня ў нас праходзіць тур "Айчыне служым", які ахоплівае вайсковыя часці, гарнізоны. Выступаем мы і перад цывільным гледачом. Пабывалі ў Кобрыне, Брэсце, Магілёве. Аўдыторыя — самая розная. Гэта, паўтаруся, не толькі вайскоўцы, але і ветэраны вайны, працы, моладзь. Удзельнічаем мы ў фестывалях, адгукаемся на запрашэнні тэлебачання, выступаем у гала-канцэртах рознай скіраванасці. Жыццё віруе!

— Ваш калектыў традыцыйна выконвае шмат беларускай музыкі, актыўна папулярызуе нашых творцаў. Як шукаеце такі рэпертуар?

— Мы яго замаўляем. Адзін з кірункаў — новыя творы, прызначаныя для патрыятычнага выхавання моладзі. Другі — разлічаныя на самыя шырокія колы насельніцтва. З беларускімі кампазітарамі і паэтамі нас звязваюць самыя шчыльныя творчыя кантакты. Вельмі запатрабаваны ў публікі песні Ігара Лучанка — яны праходзяць, што называецца, "на ўра". Добра ўспрымаюцца шчырыя, дэмакратычныя мелодыі Эдуарда Зарыцкага. Песні Алены Атрашкевіч уражваюць сучасным стылем, арыгінальнымі гармоніямі, рытмамі. З'явілася ў нашым рэпертуары і новая песня — "Пажаданне" Алега Елісеенкава на словы Тамары Талкачовай з Полацка, спявае яе Ганна Сцепанкова. Такі ж беларускапесенны вектар — у дзіцячай музычнай студыі "Зорачка", створанай пры Ансамблі. Бывае, натхненне ў аўтараў ёсць, але напісаць песню не так лёгка. Штосьці я і сам ствараю. Не так даўно на словы ўсё той жа Тамары Талкачовай нарадзілася новая кампазіцыя "З табой, Беларусь!". Сучасныя аранжыроўкі даюць другое жыццё папулярным народным мелодыям. Тым больш, што пры іх выкананні ўзнікае сінтэтычнае музычна-танцавальнае дзеянне: да хору і аркестра далучаецца наша балетная група. Так адбылося, да прыкладу, са знакамітай песняй "Касіў Ясь канюшыну…" з рэпертуару "Песняроў": спачатку яна гучала толькі ў харавым ці аркестравым выкладанні, а цяпер далучыўся яшчэ і балет.

— Не думаеце над запісамі такіх твораў? Гэта ж таксама — моцны сродак папулярызацыі і нацыянальнай культуры, і ўласна вашага калектыву…

— Чаму ж не? Рыхтуем кампакт-дыск "Песні роднай Беларусі", на чарзе — запіс духоўнай праграмы. Не здзіўляйцеся: наш калектыў неаднаразова выязджаў на Міжнародны фестываль духоўнай музыкі "Гайнаўка" ў Польшчу, станавіўся там пераможцам. Сярод іншых замежных вандровак — выезды з хорам у Расію. Але, зразумела, нашы галоўныя слухачы — жыхары роднай Беларусі: вайскоўцы і цывільныя, людзі сталага веку і моладзь. Для іх і працуем. Імкнёмся пабываць ва ўсіх кутках краіны!..

"Музычныя войскі" краіны

Сёння — Дзень абаронцаў Айчыны. Як жа сустракаюць свята нашы ваенныя музыканты: Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, а таксама Узорна-паказальны аркестр таго ж ведамства? Вядома — чарадой канцэртных выступленняў. Пра гэта і распавялі нам мастацкія кіраўнікі гэтых калектываў.

— Усю вясну, — распавядае палкоўнік Яўген ДОЎЖЫК, мастацкі кіраўнік — галоўны дырыжор Узорна-паказальнага аркестра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, — мы, у асноўным, займаемся падрыхтоўкай да ваеннага параду ў Дзень Незалежнасці. Гэта важная дзяржаўная задача, да якой мы ставімся з вялікай адказнасцю. Але гэта не значыць, што ў гэты час мы не праводзім канцэртаў. На тым тыдні, да прыкладу, упершыню пабывалі ва Уздзе, на гэтым — выступаем у Мінску. Далей рушым у Полацк. У бліжэйшыя некалькі месяцаў, акрамя сталіцы, адбудуцца канцэрты ў Коласаве, Фаніпалі, Дзяржынску, Салігорску, Наваполацку, Лідзе. Запланаваны паездкі па аддаленых гарнізонах.

— А беларуская музыка?

— Самая разнастайная. Тут і песні нашых знаных кампазітараў Ігара Лучанка, Леаніда Захлеўнага, дырыжора Аляксандра Фёдарава, і аркестравыя творы Яўгена Глебава, Дзмітрыя Смольскага, Сяргея Картэса. А які фурор, у тым ліку ў замежжы, мае творчая спадчына Уладзіміра Мулявіна і яго "Песняроў"! Хацелася б, каб з намі больш шчыльна супрацоўнічалі і маладыя творцы, але яны, відаць, пабойваюцца духавога складу аркестра, бо прывучаны пісаць для струннага ці сімфанічнага. Вядома, нам даводзіцца рабіць і ўласныя аранжыроўкі. Хочам выказаць вялікую падзяку заслужанаму артысту Рэспублікі Беларусь палкоўніку Сяргею Касцючэнку — начальніку ваенна-аркестравай службы Узброеных Сіл і начальніку нашага аркестра, бо ён падбіраў дырыжораў так, каб усе яны адначасова былі яшчэ і добрымі аранжыроўшчыкамі. Але ж хочацца, каб і нашы маладыя кампазітары больш актыўна засвойвалі розныя стылі пісьма, розныя склады, спрабавалі пісаць для канкрэтных выканаўцаў, улічваючы іх магчымасці ды пажаданні. Як ні дзіўна, але нашы класікі тут больш мабільныя. Той жа Сяргей Картэс зрабіў для нас больш разгорнуты варыянт Вальса са сваёй новай оперы "Мядзведзь" паводле Чэхава — і гэты нумар паўсюль карыстаецца поспехам. Мы адкрыты для новых прапаноў!..

Пытанні задавала Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Юрыя ІВАНОВА

Прапаноў зашмат не бывае

— Вам часта даводзіцца прадстаўляць нашу краіну ў замежжы. Публіка, мабыць, паўсюль розная? Ці вельмі адрозніваецца рэакцыя на выступленні вайскоўцаў у іншых краінах?

— Дзе б мы ні былі, заўсёды сустракаем самую шчырую прыхільнасць і цудоўны прыём. У той жа Уздзе слухачы былі — як у Еўропе: добразычлівыя, культурныя. А ў замежжы мы і сапраўды бываем часта. Ужо амаль дваццаць гадоў запар ездзім у Францыю. Летась упершыню выступалі ў Парыжы. Дый сёлета, літаральна праз некалькі гадзін пасля святочнага парада 3-га ліпеня, садзімся ў аўтобус, каб паспець у французскі горад Альбервіль, што непадалёк ад Швейцарыі. Таксама чакаем іншых запрашэнняў з Францыі і Англіі, бо перамовы наконт гэтага ўжо вядуцца. Што ў Беларусі, што ў замежжы сцэнічныя пляцоўкі — самыя розныя: ад прэстыжных залаў да вулічных дэфіле. Ледзь толькі пацяплее, імкнёмся шырока разгортваць такія "канцэрты на плошчы", пад адкрытым небам. Гэта вельмі відовішчнае, амаль тэатральнае, дзейства: музыканты рухаюцца, перастройваюцца, выконваюць развароты, часам прытанцоўваюць — і пры гэтым ніколькі не страчваюць у зладжанасці, музычнай выразнасці аркестравага гучання…

— Дый рэпертуар у вас — вялізны, ажно да джаза…

— У складзе нашага аркестра ёсць біг-бэнд, якім кіруе знакаміты трубач, віртуозны музыкант Мікалай Федарэнка. Але джазавыя кампазіцыі грае і ўвесь аркестр. Увогуле ж, музыку выконваем самую розную — усё залежыць ад таго, дзе і для каго выступаем. Зараз у нас праходзіць акцыя "Ваенны аркестр — моладзі Беларусі". Адпаведны і рэпертуар: ад патрыятычнай тэматыкі да сучаснай, блізкай моладзі. Ветэранам жа прапануем найперш песні, маршы ваенных гадоў, што суправаджалі іх у юнацтве…

— А беларуская музыка?

— Самая разнастайная. Тут і песні нашых знаных кампазітараў Ігара Лучанка, Леаніда Захлеўнага, дырыжора Аляксандра Фёдарава, і аркестравыя творы Яўгена Глебава, Дзмітрыя Смольскага, Сяргея Картэса. А які фурор, у тым ліку ў замежжы, мае творчая спадчына Уладзіміра Мулявіна і яго "Песняроў"! Хацелася б, каб з намі больш шчыльна супрацоўнічалі і маладыя творцы, але яны, відаць, пабойваюцца духавога складу аркестра, бо прывучаны пісаць для струннага ці сімфанічнага. Вядома, нам даводзіцца рабіць і ўласныя аранжыроўкі. Хочам выказаць вялікую падзяку заслужанаму артысту Рэспублікі Беларусь палкоўніку Сяргею Касцючэнку — начальніку ваенна-аркестравай службы Узброеных Сіл і начальніку нашага аркестра, бо ён падбіраў дырыжораў так, каб усе яны адначасова былі яшчэ і добрымі аранжыроўшчыкамі. Але ж хочацца, каб і нашы маладыя кампазітары больш актыўна засвойвалі розныя стылі пісьма, розныя склады, спрабавалі пісаць для канкрэтных выканаўцаў, улічваючы іх магчымасці ды пажаданні. Як ні дзіўна, але нашы класікі тут больш мабільныя. Той жа Сяргей Картэс зрабіў для нас больш разгорнуты варыянт Вальса са сваёй новай оперы "Мядзведзь" паводле Чэхава — і гэты нумар паўсюль карыстаецца поспехам. Мы адкрыты для новых прапаноў!..

Пытанні задавала Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Юрыя ІВАНОВА

Пароль роднай мовы

Цягам тыдня ў розных кутках краіны прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Міжнароднаму дню роднай мовы.

Літаратурны вечар "Пароль неўміручасці — родная мова" ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа быў прысвечаны аднаму з найвялікшых знаўцаў роднай мовы. Пад час вечара прагучалі не толькі вершы Песняра ды іх пераклады на рускую, армянскую, курдскую мовы, але і ўласныя творы і проста добрыя словы гасцей свята.

21 лютага ў межах гомельскай гарадской акцыі "Размаўляй са мной па-беларуску!" у Дзіцячай бібліятэцы № 5 імя С. Маршака адбылася імпрэза "Чарую душу родным словам". Наведвальнікі пазнаёміліся з экспанатамі этнаграфічнага кутка, з маршрутамі і аб'ектамі экатурызму, а таксама з кніжнымі выстаўкамі, прысвечанымі датам пісьменнікаў.

На тэрыторыі Беларусі жывуць прадстаўнікі 140 нацыянальнасцей, кожная — са сваёй мовай. Пераканацца ў гэтым можна было 21 лютага ў Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур, дзе ў гэты дзень, па традыцыі, сабраліся прадстаўнікі армянскай, грузінскай, нямецкай, эстонскай, украінскай, яўрэйскай і многіх іншых дыяспар. Сёлета сустрэча была прысвечана тэме пісьменства народаў свету і асаблівасцям алфавітаў.

Сімвалічным працягам дня роднай мовы стала Ноч беларускай літаратуры, якую ўчора зладзіў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы. Вечарына прайшла ў фармаце свабоднага мікрафона. Кожны меў магчымасць пазнаёміцца з творчасцю сучасных літаратараў і прадставіць за кубачкам гарбаты свае творы.

Надзея ПЯКАРСКАЯ, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ

Бібліятэкам — Евангелле

У рамках правядзення ў Гродне праваслаўнай выстаўкі-кірмашу "Радасць слова" бібліятэкі абласнога цэнтра, а таксама шэраг мясцовых прыходаў атрымалі падарунак — факсімільныя выданні Слуцкага Евангелля. Гэтыя кнігі былі перададзены ў дар выдавецтвам Беларускага Экзархату.

Як вядома, Слуцкае Евангелле — унікальны рукапісны помнік XVI стагоддзя, адна з найвялікшых праваслаўных святынь Беларусі, якая лічыцца сімвалам духоўнага адраджэння нацыі. Факсімільнае выданне Слуцкага Евангелля, падрыхтаванае і выпушчанае выдавецтвам Беларускай Праваслаўнай Царквы, уяўляе з сябе практычна дакладную копію рукапіснага помніка.

Усяго ў Беларусі выдадзена 500 факсімільных асобнікаў Слуцкага Евангелля. Таму кожнае такое выданне — фактычна "на вагу золата". А тое, што гэтыя кнігі будуць запатрабаваны чытачамі гродзенскіх бібліятэк, — несумненна.

— Я сама прысутнічала на выстаўцы пад час перадачы гэтых выданняў і магу дакладна сказаць, што гэтыя ўнікальныя кнігі будуць абавязкова запатрабаваны ў бібліятэках горада, — адзначыла "К" намеснік дырэктара Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Яўхіма Карскага Марына Ігнатовіч.

Па словах кіраўніцтва ўстановы, бібліятэкі Гродна перыядычна атрымліваюць у падарунак ад чытачоў і розных арганізацый шматлікія кнігі, у тым ліку — і вельмі каштоўныя.

— Летась, у рамках Года кнігі, намі была зладжана акцыя "Дакраніся да гісторыі", — распавяла Марына Ігнатовіч. — З яе дапамогай мы змаглі атрымаць у дар разнастайныя старыя выданні з прыватных калекцый. А, напрыклад, зладзіўшы сумесную выстаўку з бібліятэкай касцёла ордэна францысканцаў, мы атрымалі ў падарунак нават старадрукі XVI стагоддзя!

Але гэта ўжо тэма для іншага артыкула. Больш падрабязна пра кніжныя акцыі і наватарскія ідэі Гродзенскай абласной бібліятэкі "К" паведаміць у бліжэйшых нумарах.

Увага! Ідзе падпіска!

НАГАДВАЕМ!
ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" НА САКАВІК І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ І-ГА ПАЎГОДДЗЯ!

Падпісныя індэксы:
індывідуальная падпіска — 63875,
ведамасная падпіска — 638752.

Рэгіянальны — не значыць "пад капірку"

Дырэктар музея з Вілейкі дзеліцца сваім бачаннем паспяховай стратэгіі для ўстановы культуры

Не сакрэт, што ўмовы жыцця музеяў сёння ўсё больш і больш дыктуюць нам тэндэнцыю: установа павінна здзіўляць ды забаўляць свайго наведвальніка, нават перыядычна забываючыся на навукова-даследчую работу (такая выснова, мяркую, датычыцца найперш рэгіянальных музеяў, дзе толькі адзінкавыя супрацоўнікі вядуць навуковыя, выставачныя, экспазіцыйныя і ўсе магчымыя кірункі). Узгадваецца дэвіз зальцбургскіх калег: "Цудоўным прыкладам сучаснага музея лічыцца той, які можа інфармаваць і, у той жа час, забаўляць сваіх наведвальнікаў". Да такой практыкі ўсё больш падыходзім і мы.
Пад час наведання ў замежжы як буйных, так і невялічкіх гарадоў заўжды здзіўляла тое, што ў кожным мясцовым музеі ўсё ўбачанае ў залах можна ў выглядзе сувеніра, копій прадметаў набыць на выхадзе ў краме. У любой установе, нават вельмі сціплай і невялічкай, можна наведаць кавярню, збольшага — ва ўтульных ўнутраных дворыках з тэрасамі ды калонамі. І ўсё гэта было напрыканцы 1990-х, калі мы пра гэта не чулі і не марылі. Крыху паразважаўшы ды прыгадаўшы цікавы вопыт замежных калег, падзялюся ўласным бачаннем сучаснага музея. А чаму б сія-тыя ідэі не ўвасобіць у рэальнасць?

Музей музычных інструментаў у Фенікса.

Профіль — як выйсце?

Вельмі здзівіў мяне Музей музычных інструментаў у амерыканскім Фенікса. Здзівіў не толькі фарматам, фантастычнымі плошчамі, заламі, тэатрам, але і тым, што ў ім прадстаўлена абагульненая гісторыя музычных інструментаў усяго свету. Падарожжа па свеце музыкі пададзена ў пяці геаграфічных галерэях. Паўсюль выкарыстоўваецца самая сучасная аўдыя- і відэатэхніка, для наведвальнікаў адкрыта шыкоўная кавярня. Зрэшты, угледзены, быў бы запатрабаваны і ў нашай сталіцы Музей беларускіх народных інструментаў, з канцэртнымі пляцоўкамі, на якіх маглі б выступаць розныя калектывы — і не толькі фальклорныя.

Наогул, яшчэ шмат сімвалаў Беларусі не атрымалі свае музеі, што магло б здзіўляць замежнікаў, а галоўнае — прыносіць прыбытак. Гэта і Музей саломкапляцення, які мог бы ўразіць не горш за "бурштынавы пакой". Ці ўзяць хаця б інтэрактыўны Музей беларускіх народных гульняў і забаў — нават у фармаце скансена. Кожны замежнік, наведваючы нашу сталіцу, з захапленнем фатаграфуе, разглядае, вывучае галоўны праспект, бо гэта адмысловы музей архітэктуры савецкага часу. А якую папулярнасць займеў бы Музей савецкага побыту, дзе можна наталіць смагу з савецкіх аўтаматаў з газіроўкай, а таксама наведаць, акрамя экспазіцыі, кавярню ў савецкім стылі, нават з афіцыянтамі ў піянерскіх гальштуках! Зрэшты, падобныя праекты "К" агучвала неаднаразова са сваіх старонак.

Неаднойчы вялася гаворка і пра тое, што многія нашы рэгіянальныя музеі падобны адзін да аднаго: паўсюль сустрэнеш выстаўку сялянскага побыту, экспазіцыі, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны і г. д. Сапраўды, музеям бракуе фантазіі і крэатыву, але збольшага ім не стае фінансаў на рээкспазіцыю, на абсталяванне і дызайнера з сучасным бачаннем. Магчыма, трэба стварыць праграму спачатку на рэгіянальным ды абласным узроўнях, а потым і на дзяржаўным, дзе асэнсоўвалася б роля кожнага раённага музея ў сістэме каштоўнасцей (я маю на ўвазе музейныя і культуралагічныя), а пэўнай установе адводзілася б канкрэтная ніша? Напрыклад, адзін раён сваю музейную дзейнасць будзе будаваць на паказе і распрацоўцы тэматыкі партызанскага руху, другі — на інсітным мастацтве, трэці — на сплаўных промыслах, рыбалоўстве, іншы — на шапавальстве, і г. д. Уся інфраструктура падпарадкоўваецца тэматыцы. Такім чынам, кожны музей будзе мець сваё непаўторнае аблічча і развівацца па выбраным кірунку.

Будзе піяр — будзе і міжмузейны кантакт

Яшчэ ёсць чаму павучыцца нам у плане рэкламы і PR-дзейнасці. Спецыялісты адзначаюць, што тэхналогіі "public relations" прымяняюцца ва ўсіх сферах жыцця грамадства. Імідж, брэнд мае статус актыву, а добра арганізаваная, сістэматычная PR-дзейнасць становіцца стратэгічным рэсурсам. Залогам доўгатэрміновага поспеху такога супрацоўніцтва, акрамя крэатыўнасці і прафесіяналізму, з'яўляецца гатоўнасць музея падзяліцца інфармацыяй, уменне супрацоўнікаў яе падаць. Апошнюю задачу можна вырашыць, напрыклад, з дапамогай фарміравання інфармацыйнага партфеля для СМІ. Для музея можа аказацца станоўчым любы піяр, нават выдуманая гісторыя пра прывід, якая адыграе і значную ролю ў паляпшэнні фінансавага становішча музея. У працяг гэтага кірунку — сусветная практыка, калі скарбніцы адкрываюць доступ да сваіх калекцый праз Інтэрнэт, папулярызуючы фонды з дапамогай разнастайных медыятэк, стварэння віртуальных экспазіцый.

Лічу, надышоў час, калі і беларускія рэгіянальныя музеі павінны стаць значнымі цэнтрамі міжнароднага супрацоўніцтва. Не сакрэт, што багата сусветна вядомых асоб — выхадцы з невялікіх гарадоў ды мястэчак нашай зямлі. Аднак міжмузейнае супрацоўніцтва не развіваецца ці развіваецца марудна менавіта там, бо ніякі рэгіянальны музей не можа забяспечыць на належным узроўні захаванне і экспанаванне брэндавых еўрапейскіх выставак. Па магчымасці, варта мэтанакіравана ствараць умовы менавіта ў рэгіянальных музеях. Пакуль жа адпаведную марку трымаюць толькі калегі з буйных устаноў.

Музей на роліках у Находцы.

> Нашым рэгіянальным музеям сапраўды бракуе фантазіі і крэатыву, але больш не стае фінансаў на рээкспазіцыю, абсталяванне і дызайнера з сучасным бачаннем. Мо трэба стварыць праграму, дзе пэўнай установе адводзілася б канкрэтная ніша? Адзін раён сваю музейную дзейнасць будзе будаваць на тэматыцы партызанскага руху, другі — на інсітным мастацтве, трэці — на сплаўных промыслах... Так кожны займее непаўторнае аблічча і стане развівацца па выбраным кірунку.

Падземны варыянт

Не магу абысці ўвагай і адметны ва ўсіх сэнсах вопыт музейшчыкаў Польшчы, якія стварылі ў Кракаве ўнікальны музей. Як вядома, "сэрцам" гэтага горада з'яўляецца Рыначная плошча. Турыстам, якія гуляюць па Кракаўскім рынку (найбуйнейшым у сваім родзе ў Еўропе), ёсць на што паглядзець: вежа ратушы, прыгажун Марыяцкі касцёл, помнік Адаму Міцкевічу, а пасярэдзіне гандлёвыя рады — Сукенніцы... А з нядаўняга часу можна яшчэ спусціцца і пад Рынак — у Музей падземнага рынку. Падарожжа на пяць-дзесяць метраў углыб — гэта, адначасова, шпацыр на больш чым тысячу гадоў таму.

Музейшчыкі ў краіне-суседцы зразумелі, што інтэрактыўныя музеі цяпер "у модзе", таму яны зрабілі ўсё, каб таямнічая цішыня выставачных залаў парушалася размешчанымі паўсюль маніторамі, якія выдаюць разнастайную даведачную інфармацыю, а экспанаты ажываюць з дапамогай сучасных тэхналогій. Ідэя стваральнікаў гэтага комплексу вельмі простая: спускаючыся пад зямлю, вы трапляеце ў сярэднявечны Кракаў, бо пры раскопках на глыбіні больш чым чатыры метры ніжэй за ўзровень сучаснага горада археолагі знайшлі сляды старажытнага паселішча. Гэта рэшткі будынкаў і маставых, маёмасці жыхароў, чарапкі і, нарэшце, астанкі саміх гараджан. Зразумела, што вітрыны з чарапкамі ды косткамі, якімі важкімі яны ні былі б для навукі, не надта прыцягваюць звычайных турыстаў. Але пад Рыначнай плошчай наведвальнікаў чакае ажылы горад мінулага.

Рыначная плошча ў Кракаве і Музей падземнага рынку.

Сюрпрызы пачынаюцца ўжо з парога, дакладней, з закрываючай уваход дымавой заслоны, на якую транслюецца відэаролік, што паказвае кракаўчан на старой вуліцы. Далей, прайшоўшы праз "экран", трапляеш у паўзмрок падзямелля з падсветленымі экспанатамі. Паўсюль — сэнсарныя экраны з гістарычнымі даведкамі на некалькіх мовах, маленькія галаграфічныя копіі старажытных пабудоў, галерэі. Глядзіш — усе гравюры як гравюры, пакуль раптам які-небудзь кароль табе не падмігне…

А калі на... роліках?

Яшчэ адзін цікавы праект, пра які мне распавялі калегі з Расіі, — гэта Музей на роліках Музейна-выставачнага цэнтра г. Находка Прыморскага краю. Смелы праект, а лепш сказаць — эксперыментальная экспазіцыя-лабараторыя. Але звыклых ролікаў — канькоў на колах — тут няма: ролікамі ў музеі называюць шарніры, з дапамогай якіх экспанаты становяцца мабільнымі. Але на вуліцы можна пазабаўляцца на ролерных ды скейтарных трасах. У Музеі на роліках ёсць усё для юнага даследчыка: інтэрактыўныя экспанаты, карты, маніторы з відэаролікамі. Экспазіцыя абсталявана рухомымі боксамі — партатыўнымі працоўнымі месцамі для навуковых даследаванняў. Кожная такая кропка аснашчана камп'ютарнымі працэсарамі, сэнсарнымі экранамі ды навушнікамі і, да ўсяго, выконвае функцыю інфакіёска. Інфармацыя прадстаўлена ў выглядзе гістарычных відэаролікаў ды слайдаў, што знаёмяць маладое пакаленне і не толькі са знаходкамі ад старажытных часоў да сучаснасці, з гісторыяй музея або знакамітымі людзьмі Находкі.

Чатыры боксы ў музейнай лабараторыі — гэта мабільная экспазіцыя, якая лёгка перасоўваецца па зале. Яны ўключаюць тэмы: старажытнасць і Сярэднявечча, будоўля і побыт, адкрыцці і перасяленні, войны і межы… У кожны бокс уманціравана па два сэнсарныя экраны з навушнікамі. Падлетак можа паглядзець гістарычныя відэаролікі пра мінулае і сучаснасць Находкі, а таксама прапанаваць у музейную калекцыю фільмы ўласнай вытворчасці. Мультымедыйны кантэнт часткова збіраецца з Інтэрнэту, часткова ствараецца сіламі супрацоўнікаў ды наведвальнікаў. Госці Музея на роліках могуць не толькі дакранацца да экспанатаў, але і карыстацца імі. Так, да прыкладу, любы ахвотны можа паспрабаваць сябе ў ролі маслабойшчыка. Частка экспанатаў у праекце — сапраўдная, частка была адноўлена. Да стварэння экспазіцыі былі прыцягнуты падлеткі — удзельнікі творчых студый, а таксама валанцёры-школьнікі. Тут плануецца праводзіць заняткі для дзяцей па натуральных і дакладных навуках у інтэрактыўным рэжыме.

...Сваёй штодзённай працай мы павінны пераканаць нашага наведвальніка, што музей, а тым больш — музей рэгіянальны, больш не асацыіруецца з паўпустымі заламі, дзе цёмна ды няўтульна, дзе трэба гаварыць шэптам і дзе цябе "душыць" шматвекавая гісторыя, а супрацоўнікі, развесіўшы карціны па сценах ды расклаўшы экспанаты па паліцах, сядзяць і чакаюць, калі прыйдуць людзі. Яны мусяць рабіць усё, каб музей стаў брэндам мясцовасці і тым месцам, куды хочацца прыйсці яшчэ і яшчэ...

Сяргей ГАНЧАР, дырэктар Вілейскага краязнаўчага музея

Камертон

У Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры ў чарговы раз зрабілі звычайны цуд — паставілі прэм'еру. Гэтым разам аднайменную — мюзікл Генадзя Гладкова "Звычайны цуд". Спектакль атрымаўся акурат для сямейнага прагляду. З грыфам: "Рэкамендавана для дзяцей, падлеткаў і іхніх "цяжкіх" бацькоў. Прымаць у выпадках непаразумення і ў мэтах яго прафілактыкі".

Звычайная праца: "почырк тэатра"?

Колькі крокаў па лесвіцы да "...Цуду"?

Гэтая казка Я.Шварца вядомая найперш па фільме Марка Захарава (1978 г.) з музыкай таго ж Гладкова. Больш як праз трыццаць гадоў кампазітар вырашыў вярнуцца да яе і, дапісаўшы нумары, зрабіць мюзікл. Увосень 2010-га той быў увасоблены ў Маскве, наш спектакль — другі. І лепшы! Праўда, маскоўскі мне давялося глядзець у запісе. Але засведчу: у нас і аркестроўка, зробленая дырыжорам Мікалаем Макарэвічам, больш каларытная, і найцікавых рэжысёрскіх прыдумак — у разы больш, і тэмпарытм пастаноўкі больш імклівы. Дый артысты нашы, уключаючы зусім "зялёную" студэнцкую моладзь, куды больш арганічна спяваюць-танцуюць-іграюць. Так што кампазітар павінен быць узрадаваны, завітаўшы на спектакль 21 лютага і, трэба спадзявацца, 12 сакавіка на свой аўтарскі вечар у нашай сталічнай філармоніі. Дарэчы, наш тэатр — адзіны, дзе ідуць адразу тры ягоныя творы, прычым усе — у нашых аркестроўках: "Прыгоды брэменскіх музыкаў", "12 крэслаў", "Звычайны цуд". Першы са спектакляў нядаўна гучаў у зале Маскоўскай кансерваторыі імя П.Чайкоўскага — да 40-годдзя мультфільма. Шкада толькі, што ў канцэртным выкананні, бо пастаноўка, ажыццёўленая ўсё тым жа тандэмам (рэжысёр — Настасся Грыненка, балетмайстар — Дзмітрый Якубовіч), заслугоўвае ўвагі маскоўскіх крытыкаў.

Вось і ў "Звычайным цудзе" — цуд, дый годзе! Аркестр — шык ды бляск! Асабліва — у характарных нумарах, зробленых у працяг традыцый Д.Шастаковіча з "гаваркімі" сола духавых і ўдарных. Мізансцэны — супер! Чаго вартыя выезд Караля на стосе чамаданаў, партрэты яго продкаў з дзіркай для галавы, як у курортных фатографаў, карагоды хору "матылькоў", забойства чайкі (як жа без Чэхава?), стрэлы па "рухомых мішэнях", "ладдзя кахання" Тракціршчыка і Эміліі, гульня ў гольф ды многае-многае іншае! А што за акцёрскія работы! Замест падзелу на прымадонну ды астатніх — развіццё некалькіх ліній, кожная з якіх можа лічыцца адной з галоўных. Спектакль, улічваючы падвойны склад, не проста задзейнічаў "у масоўцы", а вывеў на авансцэну большую частку трупы. І галоўнае — даў магчымасць рэалізавацца моладзі, якой у тэатры шмат. Хаця майстэрні не паспявалі са сцэнічнымі строямі для ўсіх удзельнікаў, на прэм'ерныя спектаклі ўдалося выпусціць абодва склады — за выключэннем, праўда, некалькіх артыстаў, вельмі адрозных памерамі адзення ад сваіх "дублёраў".

Найбольшую інтрыгу, зразумела, утрымлівала прэм'ера "маладзёжная". Кацярына Мошчанка, якая дэбютавала ў партыі Канчыты ("Юнона" і "Авось"), стварыла цудоўную Прынцэсу — з пяшчотным "флейтавым" голасам, ідэальна чысцюткімі спевамі, сімпатычна своеасаблівым вымаўленнем, добрай пластыкай (адзін фехтавальны фрагмент чаго варты!) і, што вельмі важна, у пераходным узросце — на мяжы дзяцінства і дарослацці. Пасталеўшым "двайніком" Прынцэсы, калі тая не паслухае свайго сэрца, выступіла Эмілія — Кацярына Дзегцярова, заўсёды новая і разнастайная ў палярных эмацыйных фарбах. Прынцыпова іншым, чым у фільме, аказаўся Мядзведзь. Эдуард Вайніловіч, які раней сыграў толькі Рыфа ў "Вестсайдскай гісторыі", паўстаў гэткім "цяжкім падлеткам", падобным не на разумна-разважлівага "мішку"-філосафа, які змагаецца з выбухам эмоцый, а на Ваўчаня, што выратоўваецца ад аблавы (ну проста герой сіквела казкі пра Чырвоны Каптурык!). Нечакана ўраўнаважаным і мудрым Тракціршчыкам, гэткім "бацькам"-дарадчыкам Мядзведзя, мы ўбачылі Віктара Цыркуновіча, які раней, пры ўсёй сваёй душэўнай дабрыні, больш "спецыялізаваўся" на адмоўных персанажах. Кароль Аляксандра Асіпца, бліскучага не толькі ў ігры, але і ў спевах, стаў гарэзлівым дзіцем з зусім не бяскрыўднымі хітрыкамі. Ён, паводле беларускай версіі, — не столькі пародыя на палітычных дзеячаў савецкіх часоў, колькі другое "Я" Гаспадара (Антон Заянчкоўскі). Той таксама ўсё ніяк не развітаецца з дзіцячымі выбрыкамі, начароўваючы то куранят з пяццю лапкамі ды нясушку з вусамі, то гісторыю з Мядзведзем, якая, як ні круці, выходзіць з-пад яго кантролю. Дый увогуле, хто "камандуе" ўсімі гэтымі пераўтварэннямі, ён ці хімеры? Гэтым нашчадкам шэкспіраўскіх вядзьмарак, якія прыдуманы нашымі пастаноўшчыкамі і вырашаны сродкамі балетнай неакласікі, яшчэ б мадэрна "ў меру" — вось былі б хімеры дык хімеры! А так — бляклыя прывіды. Затое якімі яркімі атрымаліся "жывыя" персанажы! Прычым абсалютна ўсе: ад світы Караля з яскравымі характарамі (і пастаяннымі скокамі-спевамі хору, дзе кожны можа быць салістам) да выразнага і зусім не жудаснага Ката (ці ж можа каго закатаваць "сапраўдны мача" Анзор Алімірзоеў?). Шыкоўна спявае Аляксандр Крукоўскі (Паляўнічы), выбівае стэп Сяргей Спруць (Першы міністр), не стамляецца ў творчым росце таленавіты Дзяніс Мальцэвіч (Міністр-адміністратар).

І ўсё б добра, ды надта спрэчнай падалася сцэнаграфія. Можа, яшчэ і таму, што ў згаданай маскоўскай пастаноўцы менавіта яна была самай моцнай (па каштарысе — таксама): паўкруглыя сферы-шырмы, прыдуманыя архітэктарам Ларысай Ламакінай, стваралі эфект нечаканых пераўтварэнняў. А што ў нас? Цяперашні галоўны мастак тэатра Андрэй Меранкоў спалучыў свой улюбёны канструктывізм, выкарыстаны ў балеце "12 крэслаў", мюзікле "Вестсайдская гісторыя", спектаклі "Квадратура круга" ў Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры ды іншых пастаноўках, з малюнкамі Леанарда да Вінчы, змешчанымі на суперзаслоне і кулісах. Пэўна, пастаноўшчыкі імкнуліся падкрэсліць, што геніі нараджаюцца ад шлюбу чараўніка са звычайнай жанчынай. Але — не "чытаецца" гэтая паралель. Малюнкі, уражваючы класічнасцю прапорцый (вось яна, гармонія, канструктыўна "падлічаная" алгебрай!), не "ажываюць" у глядацкай свядомасці, не асацыіруюцца з героямі мюзікла, застаючыся энцыклапедычна-музейнымі звесткамі. Гэтак жа не "іграюць" механізмы, усе гэтыя вінцікі-калёсікі, што круцяцца раз-пораз. Так, яны выклікаюць асацыяцыі з гадзіннікавым механізмам і, адпаведна, з філасофскай катэгорыяй часу, запатрабаванай у казках-прытчах. Самае зубчастае з калёсікаў раптам ператвараецца ў сродак пакарання. Лесвіцы, што перасоўваюцца па сцэне, вымушаюць узгадаць пасадку ў самалёт. Іх мудрагелістыя завітушкі-упрыгожанні — сённяшніх магнатаў, што акружаюць сябе квазідаўніной. Але ўзнікае адчуванне, што ўсё гэта — быццам з іншага спектакля: халодна-іранічнага, з металічным бляскам. Ужо ў пачатку дзеі, калі трапяткую, сонечную Лесю Лют (Гаспадыня) выкочваюць на сцэну на металаканструкцыі, падобнай да перасоўнага гардэроба, гэта ўспрымаецца як замах на свабоду і сардэчнасць гераіні. Бо асацыяцыі — з клеткай, эшафотам, вешалкай для адзення, з чым заўгодна, акрамя сямейнай утульнасці і кахання. Атмасферу "механічнай пустэчы" не можа парушыць нават эклектыка сцэнічных строяў (Юлія Бабаева). Толькі — энергетыка артыстаў.

Дадам, што разнастайныя "металаканструкцыі" з лесвіцамі-масткамі-пераходамі сталі ў Музычным тэатры надта частымі. Што самае цікавае, выкарыстоўваюцца яны рознымі мастакамі, у спектаклях рознай стылістыкі, уключаючы класічную аперэту, таму ледзь не прэтэндуюць на своеасаблівы "почырк тэатра". Яшчэ можна было б зразумець, калі б гэта тлумачылася жаданнем зберагчы грошы, выкарыстаўшы часткі ранейшых дэкарацый. Але ўсё зробленае — новае. Глядзіцца ж — быццам крыху "перайначанае", перакроенае старое. Ці ж так робіць мудры гаспадар?..

Надзея БУНЦЭВІЧ

На здымку: сцэны са спектакля "Звычайны цуд". Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Фотапраекцыя



Фотавыстаўкай "Ступені" ў сталічнай галерэі "Універсітэт культуры" адкрыўся Першы Мінскі фестываль фатаграфіі. Пяць экспазіцый на розных пляцоўках беларускай сталіцы, Міжнародная канферэнцыя "Фатаграфія ў краінах Усходняга партнёрства: праблемы і вырашэнні" ў Інстытуце журналістыкі БДУ — першы форум, зладжаны Беларускім грамадскім аб'яднаннем "Фотамастацтва" прапаноўвае шэраг ініцыятыў з мэтай адлюстравання сучаснага стану беларускай фатаграфіі.

Першая фотавыстаўка — "Ступені" — на думку старшыні БГА "Фотамастацтва" Сяргея Плыткевіча, з'яўляецца адным з найбольш знакавых мерапрыемстваў. "Яна ўвойдзе ў гісторыю. Менавіта з ёю будуць параўноўваць усе наступныя фотапраекты нашага аб'яднання", — падкрэсліў ён, адзначыўшы і колькасць прадстаўленых на ёй работ (больш за сто пяцьдзясят), і колькасць аўтараў, якія прынялі ўдзел у выстаўцы, (пяцьдзясят два).

Усім членам "Фотамастацтва" было прапанавана даслаць лепшыя, на іх думку, уласныя серыі работ у Савет аб'яднання, і апошні з той тысячнай колькасці здымкаў выбраў фатаграфіі, што прадстаўлены зараз у экспазіцыі.

Да 95-й гадавіны Узброеных Сіл нашай краіны ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрылася беларуска-расійская мастацкая выстаўка "Айчыне служым". Яе экспазіцыю складаюць творы двух, так бы мовіць, профільных творчых аб'яднанняў — Студыі ваенных мастакоў імя М.Б. Грэкава (Масква) і Студыі ваенных мастакоў (Мінск).

Расійскае аб'яднанне існуе з 1934-га, наша — сёлета адзначае дзесяць гадоў з моманту ўтварэння. Беларускія мастакі прадставілі творы, прысвечаныя арміі суверэннай дзяржавы, а іх расійскія калегі — у асноўным, палотны 1950 — 1970-х гадоў пра Савецкую армію. Людзі старэйшага пакалення памятаюць карціны мастакоў студыі імя Грэкава па рэпрадукцыях у папулярных часопісах ды падручніках гісторыі СССР. Некаторыя з тых хрэстаматыйных твораў ёсць і ў гэтай экспазіцыі.

Мастакі Студыі імя Грэкава славутыя, сярод іншага, тым, што па-майстэрску робяць панарамы і дыярамы на тэмы ваеннай гісторыі. Вось і для нашага Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны яны стварылі дзве дыярамы: "Абарона Мінска 25 — 28 чэрвеня 1941 года" і "Мінскі кацёл". Першая была адкрыта

"Прыступкі" фота да мастацтва

Менавіта такі шлях цяпер актуальны для нашай фатаграфіі?

Што ж, урэшце, можа ўбачыць наведвальнік на "Ступенях"?

Фатаграфію — у самых разных яе жанрах і формах: street, пастановачную, рэпартажную, фэшн... Іранічныя замалёўкі Уладзіміра Шарнікава, фатаграфічныя фантазіі (часам па-іншаму і не скажаш) Валерыя Вядрэнкі, чорна-белую "класіку" Вадзіма Качана, палароідныя "ўнутраныя фіксацыі" Міхаіла Гаруса, студыйны перформанс Аляксандра Жарнасека, урбаністычныя эцюды Надзеі Дзегцяровай... Прызнацца, прылічаць аўтараў да пэўных плыняў і кірункаў — справа бадай заўсёды няўдзячная. Аднак у чым нельга папракнуць арганізатараў выстаўкі, дык гэта — у тым самым стылявым ці жанравым абмежаванні. Тым не менш, тая разнастайнасць спрацавала не лепшым чынам: пэўныя серыі работ побач з "яскравымі" суседзямі відавочна "губляліся", хоць, насамрэч, менавіта яны былі вартыя асобнай увагі. Эклектычны падыход да пабудовы экспазіцыі зрабіў дзіўную рэч: спарадзіў адчуванне "ўежнага абеду", але — без ясных успамінаў пра тое, чым менавіта ўдалося паласавацца. А між тым, пэўныя серыі хочацца адзначыць асобна: "Госці" Віктара Сядых, "Людзі і абліччы" Вадзіма Качана, "Чарнобыльскі сон" Сяргея Плыткевіча, "Вёска, якая знікае" Сяргея Кавалёва, "Гарады і мястэчкі" Юрыя Васільева, "Дарога дадому" Марыі Бацюковай, "Пра адзіноту" Ганны Крыловай... Аднак замест уцямнага выказвання атрымаўся "вольны набор", і ў выніку "Ступені" нагадалі, хутчэй, яскравую справаздачу аб'яднання, чым дакладна выбудаваную выстаўку, якая дапамагла б сфармуляваць, куды ж, урэшце, рухаецца сёння беларуская фатаграфія.

В.Качан. З серыі "Людзі і абліччы".



В.Вядрэнка. З серыі "Паклон Гаўдзі".



С.Плыткевіч. З серыі "Чарнобыльскі сон".

Але, як падкрэсліў Сяргей Плыткевіч, на наступны год падыход да стварэння галоўнай выстаўкі фестывалю будзе іншы: за права стаць яе кураторам будуць спаборнічаць. "Адзін фатограф прапануе свой варыянт, другі — іншае бачанне, узнікне канкурэнцыя, і такім чынам мы можам узняць узровень нашых мерапрыемстваў", — сказаў старшыня "Фотамастацтва".

Пакуль жа праграма сёлетняга Мінскага фестывалю фатаграфіі толькі распачалася. Літаральна ўчора адкрыліся рэтраспектыўная выстаўка Міхаіла Жылінскага "Крокі ў цішыні" ў галерэі "TUT.BY" і выстаўка "Глядзельная памяць гісторыі. Беларуская фатаграфія 60-х і 70-х з фондаў народнага фотаклуба "Мінск" у Музеі гісторыі горада Мінска. Наперадзе — персанальная фотаэкспазіцыя Марыі Бацюковай "Каля нуля" ў фотаклубе "Мінск" і выстаўка беларускіх фотарэпарцёраў "Калі фотажурналістыка становіцца мастацтвам" у Галерэі Міхаіла Савіцкага. А папярэднічаць апошняй, нагадаем, будзе міжнародная канферэнцыя з удзелам фатографаў Украіны, Грузіі, Малдовы і Азербайджана.

У цэлым, планаў, што інтрыгуюць, у аб'яднання "Фотамастацтва" мноства.

— У рамках буйнога міжнароднага праекта ўжо запланаваны сумесныя фотапленэры, — увёў у падрабязнасці далейшага супрацоўніцтва з партнёрамі "Фотамастацтва" Сяргей Плыткевіч. — Ідзе гаворка ў далейшым і пра стварэнне агульнай выстаўкі па выніках пленэраў, пра адкрыццё міжнароднай фоташколы на адмыслова створаным фотапартале...

Такім чынам, нягледзячы на пэўныя заўвагі, можам павіншаваць фатаграфічнае аб'яднанне з цікавым пачаткам падзейнага года. Галоўнае — каб фота стала-такі мастацтвам...

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Мастыхін

Кульмінацыя "Баграціёна"

Фрагмент дыярамы "Абарона Мінска 25 — 28 чэрвеня 1941 года".

летась, другую мінская публіка пабачыла напярэдадні Дня абаронцы Айчыны. Новая дыярама адлюстроўвае адзін з кульмінацыйных эпізодаў аперацыі "Баграціён": разгром і паланенне 105 тысяч гітлераўцаў на чале з генералам В.Мюлерам. На велізарным палатне паказана баявое ўзаемадзеянне Чырвонай Арміі і партызанаў. Расійскім мастакам у рабоце над дыярамай дапамагалі беларускія калегі.

Гэтая дыярама мае замяніць тую, што была створана ў 1980-х беларускімі жывапісцамі. Лёс таго твора ўжо вырашаны. На гэты конт музей мае дамоўленасць з губернатарам сталічнай вобласці. Для "старой" дыярамы будзе пабудавана спецыяльнае памяшканне побач з Курганам Славы — твор будзе экспанавацца якраз на месцы баёў.

П.В.

"Мастак і час"

Пад такой назвай у рамках юбілейных мерапрыемстваў да 90-годдзя Леаніда Шчамялёва адбыўся "круглы стол" у Мастацкай галерэі М.А. Савіцкага. Мадэратар — мастацтвазнаўца, арт-крытык, загадчык філіяла "Гарадская мастацкая галерэя твораў Л.Шчамялёва" Музея гісторыі горада Мінска Тацяна Бембель.

Асоба Леаніда Шчамялёва, жывапіс якога з'явіўся шматвымерным люстэркам беларускай выяўленчай культуры апошніх сарака гадоў, дала добрую нагоду прааналізаваць сучасныя складаныя мастацкія працэсы ды іх метадалагічныя асновы з новага пункта гледжання. У гэты кантэкст таксама ўваходзяць праблемы развіцця інфраструктуры мастацкіх працэсаў і арт-менеджменту у дзяржаўных музейных установах.

У пасяджэнні "круглага стала" прымалі ўдзел вядомыя мастацтвазнаўцы, культуролагі, крытыкі, музейшчыкі, журналісты, галерысты і г. д. Падрабязна аб дыскусіях пра сучасны арт-працэс — у бліжэйшых нумарах "К".

Л.Шчамялёў. "Свята".

Тэндэнцыі плюс аналітыка: ад маркетынгавай ідэі да рэальнага ўвасаблення

Што такое брэнд вёскі? Адказ нескладаны. Яе ключавая адметнасць, узведзеная ў ранг усеагульнай цікавасці, заснаванай на гістарычна-этнічных, прыродна-экалагічных, фальклорна-абрадавых і яшчэ шмат на якіх цікавостках, што нязменна вабяць турыста, у тым ліку замежнага... Патлумачыць нескладана — складана ажыццявіць. Дакладней — зрабіць ідэю "асязальнай", а ў далейшым — бюджэтаўтваральнай і вёсказахавальнай. У Расіі, кажуць, нават вясковыя філіялы правінцыйных музеяў упэўнена становяцца інтэрактыўнымі ды максімальна "прынаднымі" для ўнутранага і знешняга турызму. У выніку пасярод палёў і пустак узнікаюць гатэлі ды гатэльчыкі.

На Беларусі працэс вясковага рэбрэндынгу прабуксоўвае які ўжо год. Удалыя маркетынгавыя пошукі, даведзеныя да сапраўды падзейных мерапрыемстваў, застаюцца адзінкавымі: прысмакі з Моталя, фартушкі з Бездзежа, шапавальства з Дрыбіншчыны... Між тым, менавіта вакол названых брэндаў-артэфактаў і закручваецца дзейнасць па рэалізацыі нашай дзяржаўнай палітыкі ў сферы захавання традыцый, развіцця народных мастацкіх промыслаў і культурнага складніка нацыянальнага турызму. Пра неадкладнасць такой дзейнасці гаворка вялася і на выніковай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь... Натуральна, глядзець на кожную з нашых вёсак як на самадастатковы аб'ект турыстычнага прыцягнення пакуль не выпадае. Нам бы захаваць ды развіць тое, што маем...

А ВАША ВЁСКА ЯШЧЭ

Ручнік, фартушок, магерка — ці сталі яны маркай у маштабах краіны?, або Як адметнасці нашых сельскіх паселішчаў працуюць на іх адраджэнне?

Дзе тая Неглюбка?

Калі няма брэнда, яго трэба прыдумаць. Ці вярнуць з забыцця. Для Неглюбскага сельскага цэнтра ткацтва другі варыянт — больш дарэчны. Справа ў тым, што з два дзясяткі гадоў таму ў гэтай вёсцы Веткаўскага раёна працаваў ці не цэлы ткацкі цэх, вытворчыя магчымасці якога дазвалялі знаным майстрыхам радаваць увесь свет (да прыкладу — Японію і ЗША) унікальным мясцовым арнаментам, увасобленым на не менш унікальнай тутэйшай тканіне. Пра тую ўнікальнасць неаднаразова пісала на старонках "Культуры" дырэктар Веткаўскага музея Галіна Нячаева...

Чарнобыльскае перасяленне ды распад Савецкага Саюза якасна змянілі сітуацыю з неглюбскім брэндам. На жаль, не ў лепшы бок: цэх, дзе поруч са сталымі ткачыхамі працавалі і маладыя, спыніў існаванне. Але колькі лес не выкарчоўвай, а парасткі праз час з'яўляцца. Так пакрысе адрадзілася і пераемнасць неглюбскага ткацтва — на базе мясцовага клуба быў створаны Неглюбскі сельскі цэнтр ткацтва. Узначаліў яго Уладзімір Кавалёў. Ягоная жонка Людміла, а таксама Таццяна Суглоб прадоўжылі калісьці распачатую справу. Кажуць, штат Цэнтра павялічыўся нядаўна яшчэ на адну ткачыху. Як распавядае дырэктар Веткаўскага РАМЦ Надзея Сахарук, летась пры Цэнтры адкрыўся клуб ткачых, у якім налічваецца з дзясятак рамесніц, кожная — далёка не маладога веку. Аднак і моладзі, па словах Надзеі Сахарук, хапае: у ткацкім гуртку — трынаццаць чалавек.

Упраўленне культуры Гомельскага аблвыканкама, разумеючы важнасць неглюбскага брэнда, трымае пад пільным кантролем яго раскрутку. З абласнога бюджэту з гэтай мэтай было выдаткавана 250 мільёнаў рублёў. Так пры Цэнтры з'явіліся крама па рэалізацыі сувенірнай прадукцыі і музейны пакой гісторыі мясцовага рамесніцтва. Намеснік старшыні Веткаўскага райвыканкама Сяргей Кончыц упэўнены, што сённяшняя неадкладная задача — павышэнне вясковага статуса, далейшыя піяр і прасоўванне неглюбскага ручніка. І гэта не проста словы: менавіта ў Неглюбцы пачалі ладзіць раз на два гады абласное Свята беларускага ручніка (аналагічнае раённае стала штогадовым), правялі, па словах дырэктара РАМЦ, ужо два міжнародныя экалагічныя форумы. Падзеі мелі шырокі розгалас. Хапала і ахвотных набыць сапраўдны ручнік. Толькі дзіцячай прадукцыі ткацкага гуртка было рэалізавана на некалькі мільёнаў рублёў. А творы дарослых майстрых каштуюць на парадак вышэй і імі цікавяцца цяпер не толькі шараговыя турысты. Распавядаюць, што неглюбскія ручнікі набылі для прэзентацыйных мэт кітайскія дыпламаты. Дык мо неўзабаве пытанне шараговага беларуса "А дзе тая Неглюбка знаходзіцца?" адпадзе само сабой?

А пакуль на парадку дня — работа па стварэнні маштабнага розгаласу вакол такой з'явы, як неглюбскі ручнік. Сяргей Кончыц перакананы, што толькі ў такім выпадку да вёскі вернецца яе былая сусветная слава. Зусім іншая справа — як гэты розгалас арганізаваць. Неаспрэчна адно: без спецыялістаў-маркетолагаў тут ніяк не абысціся...

> Прадчуваю пярэчанні магчымых апанентаў: "Брэнды вёсак — рэч добрая, але навошта яны, скажам, аграгарадкам, дзе ўжо склалася сацыяльна-культурная інфраструктура?". І адказ на пытанне — напагатове: брэндавасць — найперш пазнавальнасць адметнасці. Я аднойчы прапанаваў сябрам для прагляду фотаздымкі з аграгарадкоў ці не кожнай з абласцей краіны, папрасіў знайсці розніцу. Не знайшлі! Бадай, і не скажаш: вось аграгарадок, што на Гродзеншчыне, а вось — што на Гомельшчыне. А брэнд — гэта "разыначка", цікавостка і знешняя, і ўнутраная... Ізноў паўтаруся: не адным днём жывём.

Бездзеж — гэта не толькі фартушок

На той жа выніковай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ішла гаворка пра неадкладнае брэндавае прасоўванне не толькі слуцкіх паясоў, але і бездзежскіх фартушкоў, якімі так славіцца Драгічыншчына. Пра гэты, недараскручаны ў маштабах рэспублікі, вясковы брэнд "К" нядаўна пісала па выніках нашай "выязной рэдакцыі" на Брэстчыну. Таму спынюся толькі на ключавых момантах далейшага развіцця не столькі вёскі Бездзеж, колькі мясцовага Музея народнай творчасці. Дарэчы, пашырае сферу ўплыву музейны комплекс са своеасаблівым філіялам "Сялянскі падворак "Каля Плэса", дык усё большыя перспектывы з'яўляюцца і ў вёскі.

Але пра падворак, дзе можна не толькі пазнаёміцца з новай экспазіцыяй у фармаце open air, але і адпачыць як след, мы распавядзём крыху пазней. Спачатку — пра фартушок, за паўсюдную прэзентацыю якога выступіла на выніковай калегіі Міністэрства культуры намеснік начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення — начальнік упраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга.

Дык вось, у экспазіцыі згаданага музея — 50 фартушкоў, адзін з іх быў створаны аж у 1880-м. Гэты залаты фонд традыцыйнага бездзежскага адзення стаў узорам для шматлікіх рэканструкцый і ператварэнняў, якімі больш за дзесяць гадоў займаецца мясцовая школа народнай творчасці з класамі "Вышыўка" і "Карункапляценне". Аднак ці хапае ёй "магутнасці" для таго, каб забяспечыць сувенірны рынак Беларусі адмысловымі фартушкамі? "Пакуль не хапае", — кажа начальнік аддзела культуры Драгічынскага райвыканкама Леанід Куроўскі. Вырабам унікальнай прадукцыі займаюцца толькі дзве майстрыхі. Аднак, як распавядае далей начальнік аддзела, Міністэрства культуры і ўпраўленне культуры Брэсцкага аблвыканкама прапанавалі Драгічыншчыне, у ліку трох раёнаў вобласці, прыняць удзел у своеасаблівым конкурсе праектаў па падтрымцы вырабу і рэалізацыі сувенірнай прадукцыі.

— Калі адкрыецца фінансаванне нашага праекта, — паведамляе Леанід Куроўскі, — тады з'явіцца і дадатковае абсталяванне, значыць — павялічыцца і колькасць майстрых...

А памяшканне пад дадатковую майстэрню было вызначана рашэннем райвыканкама яшчэ летась: выраб фартушкоў будзе наладжаны ў будынку сённяшняга музейнага фондасховішча.

Словам, перспектывы "сувенірнага" развіцця Бездзежа — даволі акрэсленыя. Але ж той попыт на фартушкі яшчэ трэба забяспечыць — за кошт рэкламы, піяру, нечаканых і арыгінальных маркетынгавых прыёмаў. А што зроблена тут? Па словах начальніка мясцовага аддзела культуры, рэалізацыя калісьці пачалася з малога: кожны з наведвальнікаў музея, сядзібы "Каля Плэса" што-небудзь ды набываў. Цяпер музейны комплекс кожны год "прапускае" праз свае паслугі ў сярэднім 10 — 15 тысяч турыстаў. Дый мясцовы рынак сбыту — досыць трывалы. Перад кожным святам вяскоўцы замаўляюць падарункі менавіта ў мясцовым музеі: мода такая пайшла. Аналагічнай моды ў маштабе рэспублікі пакуль няма. Але я не стаў бы абвінавачваць у гэтым аддзел культуры Драгічынскага райвыканкама. Падаецца, для рэкламы фартушкоў ён зрабіў усё, што мог. А канкрэтней кажучы — стварыў сайт www.fartushok.brest.by. І абласная прывязка тут — невыпадковая.

Справа ў тым, што Музей народнай творчасці "Бездзежскі фартушок" і сядзіба "Каля Плэса" прапаноўваюць не толькі начлег у сядзібнай гасцёўні на адну сям'ю, не толькі агляд музейных экспазіцый ды пачастунак ад вясковых кулінараў, але і выезды да Брэсцкай крэпасці, Белавежскай пушчы, у музеі Моталя... Для гэтага ёсць і транспарт, і мясцовы гід-экскурсавод. Так што з пазабюджэтам ва ўстановы — усё як мае быць. Першыя мільёны пачалі паступаць і ад продажу фартушкоў.

Безумоўна, у ідэале, у буйных беларускіх гарадах праз час павінны з'явіцца фірмовыя сувенірныя крамы не толькі пад назвай "Слуцкія паясы", але і "Бездзежскія фартушкі", "Валёнкі з Драгічыншчыны", "Кераміка з Шуміліншчыны", "Ручнікі з Неглюбкі"... Дай бог, каб спіс гэты неўзабаве можна было доўжыць і доўжыць.

Залессе, Заброддзе, Забалацце... Знайсці розніцу

У ідэале, не пашкодзіла б, каб кожнае больш-менш буйное і пакуль яшчэ немаланаселенае вясковае паселішча, што дбае пра сваё перспектыўнае (і не толькі турыстычнае) развіццё, займела ўласны брэнд. Урэшце, гэта элементарная патрэба часу, частка, калі хочаце, дзяржаўнай палітыкі па захаванні нацыянальнай бяспекі краіны. Мо я і памыляюся, але мяркую так: вёска без брэнда (чытай: без этнічнай, фальклорнай ці гістарычна-архітэктурнай цікавосткі) вырачана на паступовую стагнацыю. Так знікаюць з карты Беларусі вёскі, дзе ў выніку аптымізацыі закрываюцца школы, крамы, клубы і бібліятэкі. Між тым, усе гэтыя ўмоўныя Залессі, Заброддзі і Забалацці мелі свае гаворкі (чым не брэнд, які яшчэ рэдка хто раскручваў?!), абрады, звычаі, гендэрныя прыярытэты (пра вясковы матрыярхат у наладжванні здаровага ладу жыцця таксама мала хто (чытай: ніхто) згадвае), рамесніцкія адметнасці, прыродныя помнікі, а таксама — архітэктурныя нюансы, што з'явіліся пасля аграгарадоцкіх забудоў... Брэндам маглі б стаць нават асаблівасці ландшафту. А з якой-небудзь, лічы, зніклай вёскі можна і наогул зрабіць прыцягальнае паселішча, дзе займеюць свае майстэрні рамеснікі з навакольля.

Хтосьці запытаецца: "А навошта гэтая брэндавая мітусня?" Прынамсі, не толькі для наладжвання стабільнай вытворчасці адметнай сувенірнай прадукцыі. Хоць і тут, я упэўнены, крыецца далёка не малы рэзерв: да прыкладу, далейшага развіцця нашых дамоў рамёстваў. Пад час журналісцкіх камандзіровак я пастаянна пытаюся пра гэтыя перспектывы ў начальнікаў аддзелаў культуры, кіраўнікоў РДР і майстроў народнай творчасці. Адзіны канструктыўны адказ такі: трэба павялічваць колькасць філіялаў згаданых устаноў. Пагаджаюся.

Экспертны савет "К"

А зараз — пра брэндынг і рэбрэндынг беларускіх вёсак. Слова — спецыялістам, прафесіяналам, практыкам.

НЕ БРЭНД?

І калі ўжо нас напаткаў працэс аптымізацыі, дык лагічны вынік такіх перспектыўных захадаў — стварэнне філіялаў РДР у кожнай буйной вёсцы (а праз колькі гадоў толькі такія на Беларусі і застануцца). Урэшце, не адным днём жывём.

І такі задзел не толькі павялічыць колькасць рабочых месцаў ды маштабы сувенірнай вытворчасці для нашай патэнцыйна турыстычнай краіны — ён дасць аддзелам культуры новы імпульс развіцця. Бо менавіта работнікі культуры, як падаецца, і павінны займацца брэндаўтварэннем. Хаця б для таго, каб адзін аддзел не быў падобны ў сваіх творчых памкненнях на другі, каб адна вёска якасна адрознівалася і па форме, і па змесце ад другой. Да гэтай мэты пакуль — не даляцець і не дасканчыць: у нас не тое што вёскі — культурнае жыццё раёнаў, бывае, не адрозніш: гэткае падабенства шэрасці ды нецікавасці...

Але зноў прадчуваю пярэчанні магчымых апанентаў: "Брэнды вёсак — рэч добрая, але навошта яны, скажам, аграгарадкам, дзе ўжо склалася сацыяльна-культурная інфраструктура?". І адказ на пытанне — напагатове: брэндавасць — найперш пазнавальнасць адметнасці. Я аднойчы прапанаваў сябрам для прагляду фотаздымкі з аграгарадкоў ці не кожнай з абласцей краіны, папрасіў знайсці розніцу. Не знайшлі! Так, сучасныя забудовы вуліц, дзе побач пошта, крама, Цэнтр культуры і Дом быту — вонкава безаблічныя. І ніколі не скажаш: вось аграгарадок, што на Гродзеншчыне, а вось — што на Гомельшчыне. А брэнд — гэта "разыначка", цікавостка і знешняя, і ўнутраная... Цудоўна разумею, што мае думкі — збольшага ідэалістычныя. Аднак ізноў паўтаруся: не адным днём жывём. І сённяшняя безаблічнасць ператворыцца ў заўтрашнюю абыякавасць да "намацвання" хоць нейкіх перспектыў. Вельмі не хацелася б трапіць у такі тупік.

Дык як прыдумаць брэнд?

Уражанне такое, што апошнім часам "К" толькі і задае гэтае пытанне. Аднак і адказаў прапаноўвае не менш. У тым ліку — з прыцягненнем спецыялістаў "па прыдумванні". І сфера гэтага прыцягнення штораз павялічваецца, бо ўтварыць брэнд на пустым, так бы мовіць, месцы не так проста. Мы нават паспрабавалі падключыць да справы студэнтаў кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Вынікі эксперыменту чытайце ў наступных нумарах нашай газеты.

Матэрыялы разварота падрыхтаваў Яўген РАГІН

Ад рэдакцыі. Тэма брэндавасці вёсак абавязкова будзе прадоўжана. Паспрабуем назваць такія адметныя паселішчы ў іншых абласцях краіны праз колькі нумароў "К".

Рэклама павінна быць масіраванай

Дзмітрый ЧУМАКОЎ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Гомельскага аблвыканкама:

— Стварэнне брэнда вёскі трэба пачынаць з ідэі. Няхай яна будзе звязана, да прыкладу, з раскруткай Неглюбкі, яе ручнікоў. Наступны этап: рэкламна-інфармацыйнае забеспячэнне ідэі — усімі магчымымі спосабамі, ажно да інфармацыйнага спаму... Я пераканаўся, што нават пра Гомельскі палацава-паркавы ансамбль не ўсе ў Беларусі добра ведаюць. Што ж тады казаць пра вёскі? Так што без маштабнай рэкламнай кампаніі ў любой брэндавай справе не абысціся. А брэндынг вёсак, іх адраджэнне і далейшае развіццё — гэта, пагадзіцеся, справа ідэалагічная, дзяржаўная...

Што да азначанай раскруткі самой Неглюбкі, то тут таксама патрэбны якасна новыя падыходы. У вёсцы патрэбна праводзіць, як мне падаецца, штогадовае прадстаўнічае, яркае і цікавае мерапрыемства. Але папярэдне неабходна да драбніц прадумаць арганізацыйна-інфармацыйнае забеспячэнне такога "ручніковага" фэсту. А самабытная Неглюбка таго вартая. Вярнуць ёй колішнюю сусветную вядомасць — значыць, захаваць гістарычна-рамесніцкую непаўторную сацыяльна-культурную інфраструктуру.

Вёску трэба любіць

Кірыл КРАЎЦОЎ, уладальнік і прадзюсар арт-вёскі Чырвоны Кастрычнік у Рэчыцкім раёне:

— Пагаджаюся з тым, што беларускую вёску адраджаць, у тым ліку, і гараджане, якія прыедуць жыць на хутары ды ў сёлы... Я, малады чалавек, фатограф з Гомеля, выкупіў старэнькія дамы вёскі, што знаходзіцца непадалёк ад Рэчыцы. У мяне ляжыць да такога жыцця сэрца. Займаюся будаўніцтвам, рамесніцтвам, земляробствам... Натуральна, хаты патрабуюць рамонту, эканамічнага прыбытку як аграсядзібы яшчэ не прыносяць. Але разам з сябрамі я здолеў прыстасаваць шэраг забудоў пад хостэл-хаты, дзе замест матрасаў — сена, ёсць у вёсцы "кінахлеў" (своеасаблівы вясковы Дом культуры), "гарбат-хата".

Уся гэтая "інфраструктура" дзейнічае пад час арт-фестываляў, дзе мы імкнёмся ўсебакова прадставіць менавіта беларускае вясковае мастацтва: спевы, рамёствы, музыку, дакументальныя стужкі пра цікавосткі рэгіянальнага жыцця. Фатографы і мастакі робяць выстаўкі сваіх твораў. Тады ў Чырвоным Кастрычніку збіраецца некалькі соцень чалавек, і не толькі гараджан, але і жыхароў навакольных вёсак...

У будучым мяркую зарабляць на экатурызме. Ёсць жаданне наладзіць кантакты з мясцовымі ўладамі, з аддзелам культуры. Я хачу супрацоўнічаць з работнікамі культуры. Урэшце, пры такім дзяржаўна-прыватным сімбіёзе могуць нараджацца і рэалізоўвацца на агульную карысць вельмі цікавыя задумкі. З суседнім прыватнікам-фермерам я ўжо такія стасункі наладзіў. Так што ёсць цвёрдая ўпэўненасць, што беларуская культура ва ўсіх яе яркіх і непаўторных праявах будзе развівацца ў нашай арт-вёсцы і надалей!..

Узяць у палон спажыўца

Святлана ПАПСУЙ, трэнер-кансультант Цэнтра сістэмных бізнес-тэхналогій, выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:

— Справа настолькі важная, што, сапраўды, патрабуе дзяржаўных падыходаў. І гэта цудоўна, што распрацавана і ўжо дзейнічае Дзяржаўная праграма адраджэння тэхналогій, традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі. Наколькі я разумею, брэндавымі з гэтай нагоды павінны стаць не толькі слуцкія паясы, але і неглюбскія ручнікі, бездзежскія фартушкі. Што варта зрабіць, каб вёскі, дзе ўсё гэтае багацце вырабляецца, сталі паўсюдна вядомымі? Я не буду закранаць вытворчыя пытанні, бо масавы выраб унікальных рэчаў так або інакш наладзіцца. Але ж іх раскрутка павінна максімальна шчыльна прывязвацца да нашай духоўнасці, менталітэту, звычаяў і традыцый, якія бяруць пачатак з Неглюбкі, Бездзежа, Слуцка. Уся гэтая інфармацыя павінна падавацца на побытавым узроўні. Да прыкладу, ткана-вышываны ручнік — гэта не толькі, скажам, абярэг, але і крыніца інфармацыі, закладзеная для нас яшчэ продкамі, як пра тое апавядаюць у самой Ветцы. І ўзноўлены традыцыйны ручнік стане для нас спадарожнікам, дарадцам і выратавальнікам цягам усяго нашага жыцця... Гэткае ж сакральнае значэнне мелі для нас, я ўпэўнена, і паясы, і фартушкі, і многія іншыя традыцыйныя ды функцыянальныя рэчы.

Інакш кажучы, патрэбны масавы мэтанакіраваны піяр на дзяржаўным узроўні. Маю на ўвазе сацыяльную рэкламу на тэлебачанні, радыё, у сацыяльных сетках, у грамадскіх месцах, транспарце, на гандлёвых упакоўках, флаерах, стыкерах, магніцках і гэтак далей. Але рэкламная інфармацыя, паўтаруся, таксама павінна ўтрымліваць духоўны змест, тлумачыць сакральную важнасць традыцыйнага беларускага мастацтва для беларуса. Словам, звяртацца трэба не да вузкага кола спецыялістаў, а да масавага спажыўца, для якога веданне нашай гісторыі заканчваецца, на жаль, курсам школьнага навучання...

Як утварыць брэнд вёскі з нуля? Што рабіць тым паселішчам, дзе не ткаліся ручнікі ды паясы? Я не паверу, што нашы сёлы — такія безаблічныя. Побач з кожным — лес, возера, рэчка, капішча, крыніца, з якімі звязаны шматлікія легенды і паданні! Проста, варта іх адшукаць, аднавіць, прымусіць працаваць на зададзеную мэту. А інтэрактыўнасці ды рэкламнай разворотлівасці гаспадары нашых аграсядзіб павінны навучыцца ў супрацоўнікаў Музейнага комплексу "Дудуткі"!..

Выкупіць хутар, стварыць фестываль

Уладзімір ШАБЛІНСКІ, дырэктар канцэртнага агенцтва, прадзюсар:

— Сёння ствараецца брэнд, імідж Мінска. Вітаю гэтае рашэнне, але, на мой погляд, пытаннем трэба было займацца гадоў дзесяць таму. А сёння варта звярнуць увагу акурат на праблемы беларускіх вёсак і хутароў. Нічога новага тут не скажу: вёскі і хутары адраджацца, у тым ліку, і тады, калі статусныя гараджане, якія маюць веды ды фінансы, пачнуць выкупляць у сельскай мясцовасці кінутыя дамы, будаваць новыя, — толькі тады вясковае жыццё насыціцца брэндавымі падзеямі.

Я, мінчанін, выкупіў хутар на Валожыншчыне, які мае сябры назвалі "Шаблі", і цягам дзесяцігоддзя сачу за лёсам вёскі. Асноўныя падзеі адбываюцца ў райцэнтрах — пра сяло згадваюць тады, калі пачынаюць шкадаваць, што адтуль з'язджае моладзь. А моладзь з'язджае таму, што яе не задавальняюць магчымасці сельскага клуба...

Менавіта на хутары мы і пачалі ствараць фестывальны рух. Гэта — толькі пачатак доўгага шляху. Тым не менш, хутар Шаблі здолеў стаць своеасаблівай культурнай пляцоўкай для творчых людзей. Пазалетась тут прайшло звыш дзясятка музычных фэстаў, а летась мы прыйшлі да больш вузкага фармату: тры фестывалі ў год. І сёлета прытрымліваемся прынцыпу "быць рэдкімі, але меткімі".

Не стаўлю задачу рабіць кожныя выхадныя падзейнымі. Да ўсяго, музычнае мерапрыемства піярыць мой хутар як аграсядзібу. З іншага боку, тут збіраюцца і выступаюць некамерцыйныя разнажанравыя, збольшага — абсалютна невядомыя для масавага гледача, музычныя гурты (іх крэда — духоўнасць), прыязджаюць творчыя асобы, іхнія сем'і, сябры. Пагадзіцеся, такі адпачынак не можа не натхняць на творчасць. А свой асноўны хутарскі музычны занятак я называю станаўленнем сучаснай клубнай культуры. І яе ўзоры пакуль можна пабачыць толькі на хутары Шаблі...

Паважаныя чытачы! Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах сённяшняга нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77 або на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** тэму на www.facebook.com/kimpressby, www.twitter.com/kultura_by!

РЭГІЁНЫ: МАЙСТАР-КЛАС КРЭАТЫВУ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

Гэтым разам матэрыял рубрыкі прысвечаны творчым знаходкам адной вобласці. Справа ў тым, што начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Вярсоцкі на выніковай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, а крыху раней — для СМІ, агучыў цэлы россып ідэй, звязаных з развіццём мясцовага фестывальнага руху. У тым, што кірунак і раней быў далёка не стандартны, сумнявацца не выпадае. Толькі за мінулы год у вобласці праведзены два міжнародныя мерапрыемствы, столькі ж — рэспубліканскіх і 16 рэгіянальных. Сярод гэтых фестываляў — IX Рэспубліканскі нацыянальных культур, праваслаўных песняспеваў "Каложскі дабравест", слонімскі "Паланэз", "Гродна-джаз", артыстычныя сустрэчы "Гродна-Беласток", рок-байк-фестываль "Хавайся ў бульбу!". Змест фестывальных мерапрыемстваў бягучага года быў абмеркаваны і на калегіі ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, пасяджэнне якой адбылося 20 лютага.

Фестывальны герой — не толькі абаранак

Скульптуры з сыру

Дырэктар Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культасветработы Ірына Дземянчук паведамляе, што ў чэрвені абласны цэнтр прыме Адкрыты фестываль сыру. Заснавальнікі мерапрыемства — упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама і адкрытае акцыянернае таварыства "Малочны свет". У фестывалі прымуць удзел малакаперапрацоўчыя прадпрыемствы рэгіёнаў Гродзеншчыны. Асноўныя мерапрыемствы пройдуць у парку Жылібера і на плошчы Тызенгаўза.

Па словах Ірыны Дземянчук, пад час сырнага свята адбудзецца тэатралізаванае шэсце, пройдзе конкурс страў з гэтага малочнага прадукту. Запланавана і прэзентацыя скульптур, якія таксама будуць выкананы з "сыраматэрыялу".

Прадукцыя "Малочнага свету" карыстаецца попытам і добра вядомая не толькі ў кожным раёне вобласці. Спадзяёмся, гэткі ж лёс напаткае і Фестываль сыру.

Рэй будзе весці квас

Чарговы фестываль павінен таксама паспрыяць турыстычнай прывабнасці Гродзеншчыны. Гаворка — пра Фестываль квасу, які запланаваны на верасень у Лідзе. Начальнік аддзела культуры Лідскага райвыканкама Уладзімір Самсонаў распавядае, што ідэю гэтую гараджане ўспрынялі на ўра. Але "смачны" фэст запросіць да ўдзелу не толькі найбуйнейшага ў вобласці вытворцу гэтага напою — у госці да Лідскага квасу прыедуць усе яго рэспубліканскія "калегі". Восеньскую Ліду таксама чакаюць тэатралізацыі, шматлікія творчыя акцыі і разнастайныя канцэртныя праграмы. А ідэя "смачнага" фестывалю не можа не натхніць іншыя рэгіёны рэспублікі на пошук уласных і брэндавых у перспектыве культурных праектаў ды тэматычна-жанравых доўгатэрміновых акцый.

Тэатр — на вуліцы

Паколькі на Гродзеншчыне дзейнічае каля 300 самадзейных тэатральна-драматычных фарміраванняў (гурткоў, студый, батлеек і г. д.) ды звыш паўсотні з іх атрымалі званні заслужаных, народных і ўзорных, чарговы фэст у вобласці вырашана прысвяціць вулічным тэатрам. Такое мерапрыемства таксама мяркуецца правесці ў першы месяц восені.

Дырэктар Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культасветработы Ірына Дземянчук кажа, што такі нестандартны фэст не можа не прыцягнуць павышаную ўвагу да самадзейнага тэатральнага мастацтва. Калектывы запоўняць вуліцы і пляцы Гродна, прадэманструюць лепшыя ўзоры сваёй творчасці... Да слова, свята вулічных музыкаў у свой час спрабавалі ладзіць у Ашмянах. Па усім відаць, Гродзеншчына становіцца заканадаўцай моды на разнастайнасць фестывальнага руху.

■■■

Апрача згаданых мерапрыемстваў, падкрэслівае Ірына Дземянчук, у бягучым годзе пройдуць не менш знакавыя для вобласці творчыя акцыі. Сярод іх — фестывалі абрадаў і рамёстваў у Лідзе і ў аграгарадку "Гудзевічы" Мастоўскага раёна. У гадавым плане новых праектаў — і Абласное свята абаранкаў у Смаргоні…

Яўген РАГІН

На здымках: ля сцен Лідскага замка збяруцца аматары квасу.

Магілёўшчына: партрэт прафесіянала

Калькуляцыя бяросты

Маркетынг рамяства

На Магілёўшчыне мастацтва апрацоўкі бяросты сёння не вельмі распаўсюджана. Ім займаюцца лічаныя майстры, да прыкладу, Клічаўскага і Асіповіцкага раёнаў. І спецыялізуюцца яны збольшага на вырабе берасцяных пано. А вось традыцыйная разьба і цісненне — справа надзвычай рэдкая. Менавіта таму творы маладога майстра Яўгена Хаменкі — ці не на вагу золата.

Таленавіты хлопец нарадзіўся ў вёсцы Юрцава Аршанскага раёна, цяпер жыве і вучыцца ў Магілёве. Для Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці майстар стаў сапраўдным адкрыццём. Работы Яўгена раней не экспанаваліся на буйных выстаўках, конкурсах і фестывалях народнай творчасці. Творчым дэбютам для яго стала калядная выстаўка ў МАМЦНТ, дзе прэзентаваліся вырабы мясцовых майстроў народнай творчасці. Ягоная бяроста стала перлінай экспазіцыі. Аздобленыя шматслойным арнаментам шкатулкі, рамкі для фотаздымкаў, бранзалеты, каралі, берасцяныя бутэлькі выкананы пры дапамозе цісненння і разьбы, некаторыя — з выкарыстаннем інкрустацыі. Наведвальнікі выстаўкі былі захоплены вытанчанымі і далікатнымі бярозавымі карункамі.

Яўген Хаменка — самародак, для яго творчасць — частка жыцця, а з бярозавай карой ён працуе са школьных гадоў. У свой час атрымаў дыплом абласнога этапа Рэспубліканскай выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва навучэнцаў "Калядная зорка". Цяпер вучыцца ў Магілёўскім архітэктурна-будаўнічым каледжы, але марыць і пра мастацкую адукацыю. Пакуль набывае яе самастойна, асвойвае новыя рамесніцкія тэхнікі і прыёмы, напрыклад, пляценне з бяросты.

Імкнецца зарабляць на ўласных вырабах. Ці рэальна гэта? Яўген мяркуе, што так. Але для гэтага патрэбна не толькі майстэрства. Не лішнім будзе і досвед маркетолага, бо зрабіць унікальны твор — гэта палова справы, трэба яшчэ яго прадаць. Сувенірныя крамы пакуль не надта распаўсюджаны, кірмашы і выстаўкі-продажы праводзяцца не часта. Для рэгулярнага прыбытковага продажу застаецца карыстацца Інтэрнэтам: у Сеціве ёсць спецыялізаваныя сайты, дзе кожны ахвотны можа выбраць і замовіць у майстра вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у тым ліку — рэчы з бяросты. Яўген таксама выклаў у Інтэрнэт фотаздымкі сваіх твораў і інфармацыю пра іх, чакае заказчыкаў.

А як выставіць кошт свайму таварy? "Вельмі цяжка яго ацаніць, — прызнаецца майстар-маркетолаг. — Ты ўкладваў сілы, час, грошы, а пакупнік часцяком гэтага не разумее, не пагаджаецца з рэальнай цаной. Яшчэ больш павялічвае кошт інкрустацыя каштоўнымі ці напаўкаштоўнымі камянямі… Мала хто ведае, што і бяроста назапашваецца толькі ў пэўны час: у спякотныя дні на пачатку лета. Інакш матэрыял будзе няякасным. Дарэчы, нарыхтоўваю я яго без нанясення шкоды прыродзе, асцярожна выразаючы толькі невялікія пласты кары…"

Яўген ахвотна дзеліцца і іншымі "берасцянымі" таямніцамі. Вы заўважалі, якое чыстае паветра ў бярозавым гаі? Гэткія ж гаючыя бактэрыцыдныя якасці, аказваецца, маюць і вырабы з бярозавай кары, дзе ёсць кампаненты срэбра. У берасцянках добра захоўваюцца малако, смятана, кедравае масла, жывёльны тлушч, мёд, салёная рыба... У спёку ў такі посуд можна наліць квас — ён будзе прахалодным, а малако ў берасцянцы не кісне з тыдзень. Соль і цукар у гэткім посудзе практычна не набіраюць вадкасць, а берасцяныя заколкі ды абадкі не збіраюць статычнай электрычнасці. Словам, усе гэтыя рэчы — карысныя для здароўя: супакойваюць, сагараюць, нармалізуюць крывяны ціск, здымаюць стомленасць… Сапраўды, бяроста — на вагу золата.

Вольга СЕМЧАНКА,
вядучы рэдактар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы

На здымках: малады майстар Яўген Хаменка і яго вырабы.

Віцебшчына: вобласць адзначае творчыя перамогі

Прэміі — таленавітым

Адна з самых значных культурных падзей Віцебскай вобласці — уручэнне прэмій абласнога выканаўчага камітэта па падтрымцы таленавітай творчай моладзі за 2012 год. Навучэнцы Аршанскай дзіцячай школы мастацтваў № 3 Кірыл Атрошчанка і Дзіяна Рудакова атрымалі гэтую высокую ўзнагароду "за талент і імкненне быць лепшымі".

Урачыстае ўручэнне прэміі адбылося 11 лютага на абласной калегіі дырэктараў устаноў культуры ў Віцебску. Абласная прэмія, як вядома, з'яўляецца часткай дзяржаўнай сістэмы выхавання, развіцця і станаўлення творчай моладзі, а таленавітыя людзі — аснова любой дзяржавы.

Кірыл Атрошчанка і Дзіяна Рудакова — уладальнікі пяці дыпломаў на трох конкурсах, якія праходзілі ў Беларусі і на Украіне. У намінацыі "Сола" Кірыл з'яўляецца лаўрэатам II ступені IV Адкрытага фестывалю-конкурсу юных піяністаў "Музычныя іскрынкі", што адбыўся ў Клецку, а таксама міжнародных конкурсаў — маладых выканаўцаў "Мастацтва XXI стагоддзя" (Кіеў, Украіна) і дзіцячага выканальніцкага мастацтва "Узыходжанне" (Ялта, Украіна).

А ўжо фартэпіянны дуэт Кірыла Атрошчанкі і Дзіяны Рудаковай стаў лаўрэатам I ступені названых конкурсаў у Клецку і Ялце. За кожнай з

гэтых перамог — вялікае педагагічнае майстэрства настаўніка, велізарная воля да перамогі вучняў і, несумненна, дапамога ды падтрымка бацькоў.

Настаўніку Галіне Высоцкай, лаўрэатам абласной прэміі Кірылу Атрошчанку і Дзіяне Рудаковай жадаем далейшых творчых поспехаў у 2013 годзе!

Наталля ЛАТЫШАВА,
настаўнік ДШМ № 3 Орша

На здымку: Галіна Высоцкая са сваімі вучнямі Дзіянай Рудаковай і Кірылам Атрошчанкам.

Жураўлі на Палессе (пры)ляцяць?

Частка 1

"К" неаднаразова пісала пра шматлікія праекты ў сферы рэгіянальнай культуры, якія былі ажыццёўлены ў нашай краіне пры дапамозе разнастайных праграм міжнароднага супрацоўніцтва. Паспрабуем раскрыць гэтую тэму больш шырока і практыкаарыентавана.

Сарамлівасць — не да месца

Натуральна, падобнае ўзаемадзеянне з міжнароднымі арганізацыямі дапамагае аддзелам культуры краіны прыцягваць дадатковыя — і, скажам шчыра, даволі значныя па сённяшнім часе — інвестыцыі для паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы. Прыкладам, як адзначыў на выніковай калегіі Міністэрства начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Вярсоцкі, летась толькі ў гэтым рэгіёне былі адобраны праекты трансгранічнага супрацоўніцтва на агульную суму амаль у 600 тысяч еўра! Падобныя паспяховыя прыклады міжнароднага супрацоўніцтва ёсць і ў іншых абласцях, хаця, на жаль, сустракаюцца яны не так часта.

Між тым, неаднойчы пад час камандзіровак даводзілася чуць ад культработнікаў многіх раёнаў, што яны не ведаюць, як напісаць заяўку і падаваць неабходныя дакументы для атрымання гранта — карацей, як вырашыць арганізацыйныя пытанні. А яшчэ, што, мабыць, самае галоўнае, супрацоўнікі аддзелаў культуры часцяком… "саромеюцца" адпраўляць свае праекты для ўдзелу ў міжнародных конкурсах: маўляў, яны — нецікавыя і не здолеюць прывабіць інвестара…

Для таго, каб падобныя меркаванні не перашкаджалі культработнікам у іх паспяховай праектнай дзейнасці, карэспандэнт "К" звязаўся з прадстаўніцтвамі ААН і ЕС на Беларусі і даведаўся, якія менавіта праекты цікавяць інвестараў, а таксама пра тое, наколькі складана падаць заяўку на атрыманне гранта ад названых арганізацый.

Дзе журавіны не растуць?

Спачатку — колькі слоў пра самі праекты. Так, адзін з яскравых прыкладаў, на маю думку, — той, які адбыўся ў верасні 2012 года ў Міёрах. Там мясцовыя ўлады пры падтрымцы праекта ЕС/ПРААН "Экапартнёрства" зладзілі першае экалагічнае свята "Жураўлі і журавіны Міёрскага краю".

Так, менавіта жураўлі і журавіны сабралі гасцей, арганізатараў і, вядома, мясцовых жыхароў. На імправізаваных падворках удзельнікі мерапрыемства змаглі пазнаёміцца з мясцовымі традыцыямі ды фальклорам, пакаштаваць прысмакі з журавін… Чым не прыклад выкарыстання асаблівасцей свайго рэгіёна для правядзення цікавай ды адметнай акцыі? А чаму ж падобныя міжнародныя акцыі не ладзіць, прыкладам, на Палессі, у краі балот і журавін, прыцягваючы дадатковае фінансаванне да развіцця сферы культуры?

Як распавёў супрацоўнік прадстаўніцтва Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Беларусі Уладзіслаў Хількевіч, значны вынік і ў праекта "ICRIN", які быў рэалізаваны сумеснымі намаганнямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, Дзіцячага фонду ААН, Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі і Праграмы развіцця ААН. Так, пасля завяршэння такога супрацоўніцтва ў постчарнобыльскіх раёнах Беларусі адкрыліся шэсць цэнтраў доступу да інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Яны забяспечаныя сучасным камп'ютарным і прэзентацыйным абсталяваннем, цяпер працуюць на базе цэнтральных раённых бібліятэк Веткі, Ельска і Чэрыкава, сельскіх дамоў культуры пасёлка Ільіч і пасёлка Беліцк (Рагачоўшчына), а таксама мемарыяльнага музея ў пасёлку Ліцвінавічы, што на Кармяншчыне. Сярэдні кошт абсталявання аднаго цэнтра склаў каля 9 тысяч долараў.

У рамках праекта "ICRIN" быў таксама арганізаваны конкурс лакальных праектных ініцыятыў. З больш чым ста разгледжаных заявак членамі Кансультацыйнага камітэта былі адабраны дванаццаць лепшых праектаў, прафінансаваных у 2011 — 2012 гадах. Напрыклад, вынікам аднаго з іх сталася адкрыццё і абсталяванне выставачнай залы ў Рагачове. А напярэдадні аддзел культуры тамтэйшага райвыканкама пры падтрымцы таго ж міжнароднага праекта зладзіў конкурс на лепшы сувенір для айчынных і замежных турыстаў…

Барацьба за інвестыцыі: погляд грантадаўцаў

Як прывабіць спонсара?

Праектаў, словам, хапае. Але што ж трэба зрабіць дзеля таго, каб прэтэндаваць на спонсарскую падтрымку? Нехта з начальнікаў аддзелаў культуры раёнаў знаходзіць выйсце ў тым, што наўпрост кантактуе з кіраўніцтвам музеяў ці гарадоў-пабрацімаў з суседніх краін, нехта самастойна выходзіць на прадстаўнікоў міжнародных арганізацый, акрэдытаваных у Беларусі… Шляхі тут могуць быць розныя, але галоўнае — ініцыятыва, якая павінна зыходзіць менавіта ад культработнікаў. Бо спадзявацца на тое, што ў СДК якой-небудзь вёскі ці нават у РДК райцэнтра завітае багаты спонсар з кішэнямі, поўнымі грошай, наўрад ці даводзіцца.

Вось, прыкладам, увосень 2012-га распачалася рэалізацыя праекта "Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё". Фінансаванне ў суме да 15 тысяч долараў будзе прадастаўлена прыкладна 30-ці тэматычным ініцыятывам, цэнтрам па падтрымцы бізнесу, а таксама мясцовым органам кіравання і самакіравання Брэсцкай і Гродзенскай абласцей, у якіх плануецца актыўна развіваць экалагічны, сельскі і іншыя віды турызму. "К" пісала пра дадзены праект яшчэ восенню мінулага года, але пакуль аддзелы культуры ў гэтай праграме так і не засвяціліся…

А шкада. Бо, нягледзячы на тое, што названы праект толькі стартаваў, гэта не першы досвед працы ПРААН у сферы аграэкатурызму. Напрыклад, дзякуючы арганізацыйнай і спонсарскай падтрымцы міжнароднай структуры ў гарадскім пасёлку Зэльва Гродзенскай вобласці быў адроджаны "Ганненскі кірмаш" — адзін з найбуйнейшых у мінулым гандлёвых і забаўляльных фэстаў Усходняй Еўропы. Адраджэнне яго — вынік менавіта сумесных намаганняў кіраўніцтва раёна і праекта ЕС/ПРААН "Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні". Садзейнічанне ў рамках агучанага праекта таксама атрымаў Зэльвенскі экамузей рэчаў і адзення, выробленых з традыцыйнага беларускага матэрыялу — лёну…

Як зазначылі "К" у аддзеле праектаў і праграм прадстаўніцтва Еўрапейскага Саюза, яны фінансуюць праграмы супрацоўніцтва з Беларуссю ў аб'ёме каля 100 мільёнаў еўра (калі ўлічваць і тыя, што яшчэ распрацоўваюцца). Многія начальнікі аддзелаў культуры ведаюць, што цікавыя ініцыятывы з ЕС ажыццяўляюцца ў фармаце памежнага супрацоўніцтва (праграмы "Беларусь — Польшча — Украіна", "Латвія — Літва — Беларусь", "Рэгіён Балтыйскага мора"). Гэта і распрацоўка супольных турыстычных маршрутаў, планаў культуралагічных даследаванняў, захадаў па захаванні і аднаўленні гістарычных помнікаў ды старых сядзіб… А цяпер, да прыкладу, ладзіцца цікавы рэгіянальны праект, які называецца "Сямейны альбом Усходняга партнёрства": ён спрыяе абмену досведам і супольнай творчай працы выбітных фатографаў з Арменіі, Беларусі, Грузіі, Малдовы ды Украіны…

Як адзначылі ў аддзеле праектаў і праграм прадстаўніцтва ЕС у Беларусі, актывізацыі культурных працэсаў павінна паспрыяць Першая Канферэнцыя міністраў культуры рэгіёна Усходняга партнёрства, што пройдзе ў Грузіі 26 — 28 чэрвеня бягучага года. Мерапрыемства адбудзецца ў рамках праграмы Чацвёртай платформы Усходняга партнёрства і павінна, на думку арганізатараў, стаць важнай падзеяй для ажыццяўлення дыялога ў галіне культуры.

Падаць заяўку — проста

Але наколькі просты механізм падачы заявак і прапаноў да ўдзелу ў той або іншай праграме? Галоўнае, па меркаванні супрацоўнікаў аддзела праектаў і праграм Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі, — гэта ведаць дакладна, што і з якой мэтай хочаш зрабіць. А для таго, каб прачытаць правілы і запоўніць заяўку, прыдасца веданне англійскай мовы. Па падтрымку і парады, як запэўнілі карэспандэнта "К", можна заўсёды звяртацца ў Нацыянальнае каардынацыйнае бюро па праграмах ЕС, адрасы якога лёгка знайсці ў Інтэрнэце. Дарэчы, офісам еўрапейскай экспертызы і камунікацыі праводзяцца семінары па напісанні заявак для падачы праектаў на фінансаванне ЕС…

Але варта памятаць пра тое, што па самой сваёй прыродзе шырокае супрацоўніцтва не можа быць цэнтралізаваным: у шматлікіх праграмах і праектах прымаюць удзел тысячы і тысячы актыўных людзей, сотні арганізацый, ведамстваў і суполак у дзясятках краін. На думку прадстаўнікоў міжнароднай супольнасці, трэба прыгледзецца да таго, што ўжо робіцца ў сферы, якая цікавіць, за мяжой, вызначыць патэнцыйных партнёраў і выбраць прыдатны фармат і інструмент супрацоўніцтва. А своеасаблівай "кропкай уваходу" ў інфармацыйную прастору супрацоўніцтва можа быць любы чалавек або любая арганізацыя, якія ўжо ажыццяўляюць ці ажыццяўлялі нейкі праект або праграму: ад Нацыянальнага каардынацыйнага бюро праграм ЕС да каардынатара любога з праектаў. Таму начальнікам аддзелаў культуры, якія яшчэ не маюць досведу ўдзелу ў міжнародных праектах, параіць можна толькі адно: звязвайцеся са сваімі больш вопытнымі калегамі, выходзьце праз Сеціва па кансультацыі.

Тое ж самае датычыцца і супрацоўніцтва з прадстаўніцтвам ААН у Беларусі: выхады на супрацоўнікаў, а таксама формы заявак да праграм і грантаў можна з лёгкасцю знайсці ў Інтэрнэце. Але галоўнае, паўторымся, — гэта жаданне тварыць, якое павінна зыходзіць менавіта ад культработнікаў. "Сціпласць" тут наўрад ці будзе да месца. Бо нехта рассылае дзясятак адметных праектаў у розныя міжнародныя праграмы, а іншы працягвае наракаць на недахоп фінансавання. Які шлях выбраць — справа за канкрэтным кіраўніком канкрэтнага аддзела культуры, РДК ці ЦБС…

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Рэйтынг ідэй з інтэрнэт-прасторы

Surprise ад бібліятэкара

Святлана КРЫВЕЦ, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Лідскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы

1. Праект шасці выданняў

У бібліятэках Вялікабрытаніі стаўся добрай традыцыяй "Праект шасці кніг", або "Six Book Chalenge" — "Спаборніцтва шасці кніг". Асноўная мэта акцыі — прыцягненне да кіруемага чытання (у многіх выпадках — упершыню) прадстаўнікоў розных сацыяльных і ўзроставых груп насельніцтва. Прапаноўваецца прачытаць шэсць кніг ды запісаць уражанні аб прачытаным у Сшытак водгукаў. Аўтар самага лепшага запісу атрымлівае прыз.

2. Рэалізаваць патэнцыял моладзі

У бібліятэках Даніі для прыцягнення юных чытачоў і фарміравання ў падлеткаў пачуцця прыналежнасці да бібліятэчнай прасторы праходзяць мерапрыемствы "Mindspot" — "Месца ідэй". Моладзь збіраецца, абмяркоўвае думкі, выказвае прапановы і пажаданні, што датычацца бібліятэчных сэрвісаў і праграм. У выніку гэтых дзей арганізоўваецца Art Wall — "Арт-сцяна", утварэнне для рэалізацыі творчага патэнцыялу моладзі.

3. "Лёгкая атмасфера"

У бібліятэках ЗША прыжыўся праект "Open air" — "Лёгкая атмасфера" ці "На адкрытым паветры". Бібліятэкары дзейнічаюць па-за сценамі сваіх устаноў, да прыкладу, арганізоўваюць вольны доступ да кніг у паркавых зонах. Звычайна ў такой "бібліятэцы" можна размясціць каля сотні кніжных экзэмпляраў. Кніга-абмен разлічаны на сумленных карыстальнікаў.

4. Узнагарода для чытача

І зноў пра вопыт амерыканскіх бібліятэкараў. Адна з іхніх крэатыўных акцый карыстаецца надзвычайнай папулярнасцю ў чытачоў: гэта "Book-surprise" — "Кніга з сюрпрызам". У кожную кнігу стэлажа ўкладваецца адметны прыз, але ўбачыць яго можна толькі дома. Натуральна, такія выданні разбіраюцца вельмі хутка.

5. Паліцы — нашы, прапановы — вашы

Еўрапейскі вопыт засведчыў эфектыўнасць кніжнага краўдсорсінгу — "Прапануй кнігу на нашы паліцы". Непасрэдна ў бібліятэках, а таксама на бібліятэчных сайтах карыстальнікі пакідаюць свае пажаданні на конт набыцця той або іншай літаратуры. Зыходзячы з гэтага, праводзіцца маніторынг найбольш запатрабаваных кніг. Даныя ўлічваюцца пры камплектаванні кніжнага фонду.

Я пераканана, што прапанаваныя формы бібліятэчнай работы можна і неабходна, прынамсі, апрабіраваць і ў нашых бібліятэках.

Паважаныя чытачы! Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах сённяшняга нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77 або на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** тэму на www.facebook.com/kimpressby, www.twitter.com/kultura_by!

Першабытны КПП на Дняпры

Адкуль пад Лоевам старажытны ваенны лагер?

Сярод памятных мясцін Гомельскай вобласці, уключаных у турыстычны маршрут "Залатое кольца Гомельшчыны", Лоеўскі раён вылучаецца, найперш, сваімі археалагічнымі помнікамі і ваеннай гісторыяй.

Першапраходцам навуковага краязнаўства на Лоеўшчыне лічыцца вядомы археолаг, этнограф і фалькларыст, прафесар Кіеўскай духоўнай акадэміі Уладзімір Завітневіч. Экспедыцыя 1890 года, якую ўзначаліў наш зямляк, адкрыла курганныя пахаванні на могільніках эпохі Кіеўскай Русі каля Лоева, вёсак Мохаў, Каўпень і Сінск. Менавіта экспедыцыя У.Завітневіча выявіла і першай распачала даследаванні найбуйнейшага курганнага могільніка на тэрыторыі Беларусі, што налічваў тады больш за 600 курганоў.

Яшчэ адна ўнікальная знаходка — Чаплінскі археалагічны комплекс, які ўключае гарадзішча, селішча, бескурганны і курганны могільнікі, — справа рук беларускага археолага, доктара гістарычных навук Леаніда Побаля. У 1956 — 1957 гг. малады археолаг, тады яшчэ аспірант Інстытута гісторыі, узначаліў раскопкі ў Чапліне, каб высветліць таямніцы надзвычай цікавага для навукі аб'екта. Поспех гэтай працы здзівіў навукоўцаў: за два палявыя сезоны непадалёк ад гарадзішча аспірант выявіў 238 пахаванняў-крэмацый у грунтавых ямах на глыбіні каля паўметра і вялікую колькасць пахавальнага інвентару мяжы нашай эры. Так быў знойдзены самы вялікі на сённяшні дзень бескурганны могільнік на тэрыторыі Беларусі. Усяго пры яго раскопках было выяўлена 275 гліняных пасудзін, многія з якіх захаваліся амаль цалкам, 14 жалезных наканечнікаў дзід, некалькі дзясяткаў жалезных ножыкаў, металічныя бранзалеты, пярсцёнкі. Акрамя таго, сярод найбольш каштоўных знаходак — бронзавыя фібулы: шпількі для верхняга адзення. Побаль правёў раскопкі і на пляцоўцы гарадзішча, дзе былі даследаваны фрагменты 21 заглыбленага ў зямлю жытла плошчай ад 10 да 21 квадратных метраў і шмат розных па форме ды памерах ям гаспадарчага прызначэння. Пераважная большасць знойдзеных на гарадзішчы старажытных артэфактаў належыць да мілаградскай і ранняга этапа зарубінецкай культур. Вучоны даследаваў таксама селішча, размешчанае каля гарадзішча. Былі выяўлены рэшткі канструкцый наземнага і заглыбленага ў зямлю жытла зарубінецкай культуры. Сярод знаходак — жалезныя нажы, наканечнікі дзід, стрэл.

Важным момантам у вывучэнні старажытнай гісторыі Лоеўшчыны стала адкрыццё і археалагічнае даследаванне стаянкі і могільніка бронзавага веку (2-я палова II тысячагоддзя да н.э.) каля вёскі Дзяражычы, якое ажыццявілі ў 1965-м археолагі Уладзімір Ісаенка і Іван Ціханенкаў.

На пачатку XXI стагоддзя вялікую ролю ў арганізацыйным працэсе Лоеўскага краязнаўства займаюць даследаванні Мохаўскага археалагічнага комплексу, які складаецца з гарадзішча, пасада і захоўвае рэшткі найбуйнейшага на Беларусі курганнага могільніка. Яго тэрыторыя ахоплівае не менш за 30 гектараў плошчы. З 2003 г. на гэтым археалагічным комплексе рэгулярна працуе група студэнтаў Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Скарыны пад кіраўніцтвам доктара гістарычных навук, дацэнта кафедры гісторыі Алега Макушнікава. Адметна, што археолагам дапамагаюць таксама валанцёры як з Беларусі, так і з Расіі ды Украіны.

Раскопкі выявілі прыкметы развітай рамеснай дзейнасці. У прыватнасці, сярод апошніх знаходак на Мохаўскім комплексе — фрагменты жаночых касцюмаў і галаўных ўбораў, манеты, нажы, ваенная амуніцыя і зброя, ганчарныя вырабы. Вынікі раскопак сведчаць, што ў X — XI стст. у Мохаве размяшчалася найбуйнейшае ў Беларусі і адно з самых буйных ва Усходняй Еўропе паселішчаў эпохі станаўлення Кіеўскай Русі. У курганах пахаваны ваяры, рамеснікі і гандляры. Асаблівасці пахавальных абрадаў і выяўленых пры раскопках прадметаў археалогіі сведчаць, што тут былі пахаванні не толькі ўсходніх славян, але і выхадцаў з Усходняй ды Паўночнай Прыбалтыкі.

Гісторыкі мяркуюць, што на мяжы I — II тыс. н. э. у ваколіцах Мохава знаходзілася ваенна-гандлёва-рамеснае паселішча, якое кантралявала тут найбуйнейшую транспартную артэрыю Усходняй Еўропы — Днепр, летапісны шлях "з варагаў у грэкі". Магчыма такса, што гэты ваенны лагер быў арганізаваны кіеўскімі князямі для збору даніны з радзімічаў і дрыгавічоў.

Трэба заўважыць: аналагічных помнікаў у Беларусі больш няма. Ужо зараз можна меркаваць, што Мохаўскі археалагічны комплекс мае культурна-гістарычнае значэнне, суадноснае аналагічным знакамітым помнікам у Гняздова каля Смаленска і ў Шэстовіцах каля Чарнігава. Больш за тое: Мохаўскі "некропаль" размешчаны на парэштках яшчэ больш старажытнага паселішча, а па суседстве з ім — яшчэ некалькі гарадзішчаў ранняга жалезнага веку. Відавочна, што гэтая спадчына мае міжнароднае значэнне, а таму вельмі важна зараз знайсці форму захавання Мохаўскага археалагічнага комплексу для будучых пакаленняў.

Усяго ж намаганнямі некалькіх пакаленняў археолагаў на Лоеўшчыне выяўлены і абследаваны дзве познемезалітычныя стаянкі каменнага веку, стаянка і могільнік бронзавага веку, 24 гарадзішчы, 12 селішчаў і 13 могільнікаў ранняга жалезнага веку, з якіх Чаплінскі і Мохаўскі археалагічныя комплексы — унікальныя для Беларусі.

Уладзіслаў АНІСАВЕЦ, настаўнік гісторыі Нова-Баршчоўскай базавай школы Лоеўскага раёна

На здымку: гліняныя вырабы з Чаплінскага археалагічнага комплексу.

Што ў "Запавеце Максіма Беларуса"?

Да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага распачаўся цэлы цыкл разнастайных мерапрыемстваў, скіраваных на падрабязнае знаёмства з жыццём і творчасцю выдатнага пісьменніка.

Напярэдадні дня нараджэння творцы ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася штогадовая Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя — XXI Гарэцкія чытанні "Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць". Сёлета ў традыцыйных Чытаннях узялі ўдзел некалькі дзясяткаў літаратуразнаўцаў і мовазнаўцаў, айчынных гісторыкаў. Таксама ў сценах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры адкрылася выстаўка "Запавет Максіма Беларуса" з уласных фондаў музея, а таксама збораў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Рэспубліканскага музея гісторыі медыцыны Беларусі. У выставачным праекце прадстаўлены цудам ацалелыя асабістыя рэчы творцы, у тым ліку ягоныя рукапісы. Яны ў чарговы раз прымушаюць задумацца над словамі пісьменніка: "Толькі таго прарока пашырыцца вера паміж народа, каторы быў прарокам як на слове, так і на справе".

Максім Гарэцкі.

Акрамя таго, да юбілею аднаго з пачынальнікаў сучаснай нацыянальнай прозы ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адкрылася выстаўка "Браму скарбаў сваіх адчыняю…" Экспазіцыя падрыхтавана на аснове шматлікіх архіўных матэрыялаў і друкаваных дакументаў з фонду аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў. У рамках выстаўкі можна пазнаёміцца з жыццёвым і творчым шляхам выдатнага сына беларускага народа. Сярод экспанатаў — першыя спробы пяра, датаваныя 1912 годам, рукапіс "Камароўскай хронікі", пераклад на рускую мову "Віленскіх камунараў", розныя занатоўкі, накіды, незавершаныя творы, іншыя творчыя матэрыялы, а таксама фальклорныя запісы. Экспазіцыя ўключае дакументы да біяграфіі пісьменніка, фотаздымкі Максіма Гарэцкага і яго родных, выданні твораў пісьменніка...

Захоўваюцца ўнікальныя прыжыццёвыя выданні Максіма Гарэцкага, яго публікацыі ў перыядычным друку тых гадоў ды іншыя матэрыялы, якія звязаны з жыццём і творчасцю самабытнага і яркага мастака слова, і ў фондах Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Да юбілею пісьменніка аддзелам старадрукаваных і рэдкіх выданняў падрыхтавана выстаўка "Максім Гарэцкі. Асоба і час", якая дазваляе ўбачыць першы зборнік пісьменніка "Рунь", што выйшаў у 1914 годзе, аповесць "Дзве душы", "Гісторыю беларускай літаратуры". Адметнае месца ў экспазіцыі займаюць пераклады Гарэцкага на беларускую мову твораў М.Горкага "Зброднік", "Канавалаў", А.Фадзеева "Разгром", якія выйшлі на пачатку 30-х гадоў, а таксама III том Збору твораў У.Леніна, у якім Максім Гарэцкі пераклаў артыкулы і дадаткі.

Не менш цікавыя матэрыялы выстаўкі, звязаныя з роднымі і блізкімі пісьменніка. Да прыкладу, малавядома, што кнігу "Народныя песні з мелодыямі" пісьменнік выдаў з прысвячэннем сваёй маці Ефрасінні Міхайлаўне, ад якой запісаў шмат народных песень. Прадстаўлены выданні і Леаніды Чарняўскай, жонкі пісьменніка, якая не толькі рупліва працавала на ніве педагогікі, але і зрабіла значны ўнёсак у літаратуру.

Не абмінуў сваёй увагай юбілей Максіма Гарэцкага і Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. У прыватнасці, у выставачнай зале дома Песняра днямі адкрылася выстаўка "Сябры майго далёкага юнацтва", у рамках якой прадстаўлены арыгіналы лістоў Якуба Коласа да Леаніды Чарняўскай, Гаўрылы Гарэцкага, каштоўны рукапіс успамінаў Галіны Максімаўны Гарэцкай пра бацьку, сямейныя фотаздымкі з дарчымі надпісамі…

К.А.

Мэбля для князя

Ці не ў кожным музеі ўсе экспанаты маюць незвычайную асаблівасць: яны, у літаральным сэнсе слова, умеюць размаўляць. І, у прыватнасці, могуць распавесці асабліва ўважліваму наведвальніку пра тое, як жыццё рэчаў часам непарыўна звязана з жыццём людзей. Так, прыехаўшы ў Мірскі замак і зайшоўшы ў рабочы кабінет князя Міхаіла Святаполк-Мірскага, міжволі пераносішся амаль на цэлае стагоддзе таму.

Гадзіннік на каміне, канапа, шахматны столік, пісьмовы стол, шафа з кнігамі, чыгунная пераносная печка і крэслы цудоўна дэманструюць побыт гаспадара замка. Несумненна, у падобным кабінеце князь мог адасобіцца і папрацаваць у цішыні. Як вядома, князь Міхаіл амаль дзевятнаццаць гадоў свайго жыцця прысвяціў дыпламатычнай кар'еры, пабываўшы на службе пры пасольствах у Мюнхене, Стакгольме, Пекіне, Канстанцінопалі, Лондане і Сафіі. Прыехаўшы ў Мір, менавіта ён вырашыў аднавіць старадаўні замак. Да сённяшняга дня захаваліся фотаздымкі інтэр'ераў замкавых пакояў пры Святаполк-Мірскіх. Асабліва вылучалася мэбля, якую выраблялі на месцы — у сталярнай майстэрні, што размяшчалася ў заходняй сцяне замка.

У 30-я гг. XX ст. загадчыкам мэблевай майстэрні стаў Іван Хмель, сталяр-чырванадрэўшчык вышэйшай катэгорыі. Крэслы, зробленыя ім, цяпер прадстаўлены ў экспазіцыйнай зале і з'яўляюцца аднымі з самых каштоўных прадметаў музея. Тое і не дзіва, бо яны былі зроблены для самога гаспадара замка .

Іван Хмель паходзіў з сям'і патомных сталяроў (ягоныя дзед і бацька служылі ў князёў Святаполк-Мірскіх). Цікава, што на адным з іхніх працоўных інструментаў быў зроблены надпіс "Гонар даражэй за грошы", і ўсё жыццё яны прытрымліваліся гэтага дэвізу. Дзяцінства і юнацтва Івана прайшлі ў мястэчку Мір. Ён і яго брат Георгій рана засталіся без маці, і выхоўвала іх мачаха Еўдакія, якая працавала ў князя Міхаіла белашвачкай. Іван скончыў чатыры класы царкоўна-парафіяльнага вучылішча. З дзяцінства ён быў цікаўны да жыцця, імкнуўся спазнаць новае, цікавіўся астраноміяй. Ён пісаў вершы, добра маляваў, але, пасталеўшы, захапіўся сталярнай справай. Майстар змог акружыць сябе людзьмі, якія поруч з ім стваралі прадметы мэблі, што не саступалі фабрычным, наадварот — шмат у чым пераўзыходзілі іх. У кожную створаную работу яны ўкладвалі не толькі ўсё майстэрства, але і часцінку душы.

Мэбля, зробленая ў замкавай майстэрні, вылучалася разнастайнасцю. Гэта не толькі крэслы, але і картачныя столікі на львіных лапах, шахматныя сталы з высоўнымі скрыначкамі для фігур з боку ігракоў, шафы для кніг і вопраткі, ложкі. Захаваліся да нашых дзён і прадстаўленыя ў экспазіцыйнай зале крэслы, якія здзіўляюць прадуманасцю кожнай дэталі. Спінкі крэслаў, што нагадваюць перавернутыя вазы, забяспечвалі належную падтрымку спіны. Грацыёзна выгнутыя лініі падлакотнікаў рабілі крэслы надзвычай зручнымі для працы і адпачынку, а ратангавая сетка на сядзенні дазваляла князю падоўгу заседжвацца над кнігамі і дакументамі.

Відавочна, што крэслы, якія захаваліся ў музейнай калекцыі, дэманструюць узоры сапраўднага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — прыгожую і зручную мэблю, вартую асобнай увагі гасцей Мірскага замка.

Вольга НАВІЦКАЯ, загадчык сектара па навуковай рабоце музея "Замкавы комплекс "Мір"

Вялікі рукапіс мастака, які так поўна друкуецца ўпершыню

"Свае ўспаміны напішу Вам у лісце..."

(Заканчэнне.
Пачатак у №№6 — 7 за 2013 г.)

...Побытавая неўладкаванасць, цяжкае і гаротнае жыццё ў велізарным змрочным комплексе інтэрнатаў на Мясніцкай спараджалі сярод часткі студэнтаў дэкадэнцкі настрой, дзе так званая ясеніншчына адмыслова спалучалася з нэпманствам. Стракатая карціна была і ў метадах навучання, і ў праграмах, і сярод выкладчыкаў. Акрамя жывапісу ў нас выкладаліся як самастойныя дысцыпліны прастора, аб'ём і колер. І хаця пазней іх рэзка крытыкавалі, усё ж я перакананы, што яны выхоўвалі ў будучым мастаку густ да пластычнага і кампазіцыйнага мыслення.

Акім Шаўчэнка. 1975 г.

Гэтыя прадметы выкладаў архітэктар Міхаіл Пятровіч Коржаў, дарэчы, бацька будучага знакамітага жывапісца "сурового стиля" Гелія Коржава. Колер і тэорыю колераадчування, паводле вядомага вучэння Германа Гельмгольца, вёў прафесар Фёдараў. Было мноства і тэарэтычных дысцыплін. Лекцыі па хіміі чытаў прафесар Аляксей Яўграфавіч Фаворскі — ён меў аднолькавае прозвішча са знакамітым графікам. Начартальную геаметрыю і перспектыву выкладаў прафесар Чэчэлеў. Гісторыю мастацтва — прафесар Аляксандр Георгіевіч Габрычэўскі, які дакладна адчуваў усе "таямніцы" жывапісу, асабліва эпохі Адраджэння, і прафесар Дзмітрый Мікалаевіч Сараб'янаў. Цудоўны графік і ілюстратар Уладзімір Андрэевіч Фаворскі чытаў нам лекцыі па кампазіцыі. У розныя перыяды малюнак выкладалі Леў Бруні, Канстанцін Істомін і Сяргей Герасімаў. Той самы бліскучы Герасімаў, перад якім пазней так схіляўся яго вучань — наш паважаны Віталь Цвірка. Ды я і сам схіляюся перад бліскучым талентам Сяргея Васільевіча…

Карацей, складана ўявіць сабе лепшае суквецце педагогаў, чым тое, якое было сабрана ў нас, на Мясніцкай. Самым цяжкім стаў для мяне першы курс; апрача напружанай вучобы я цярпеў і немалыя матэрыяльныя ліхтугі. На другім курсе пайшоў у майстэрню цудоўнага мастака і педагога, латыша Аляксандра Давыдавіча Дрэвіна, які, на вялікі жаль, быў расстраляны ў 1938 годзе як "вораг народа", пра што я даведаўся не так даўно. Дык вось, Дрэвін звычайна прыходзіў напрыканцы заняткаў, рабіў абход, даючы дасціпныя і слушныя заўвагі. Не выносіў усялякага кшталту крыўляння ў жывапісе і прэтэнзій на "нешта". Адначасова ён мог беспамылкова "ўбачыць" малады талент і падтрымаць яго. Тады сярод студэнтаў асабліва цанілася здольнасць "бачыць колер". Калі камусьці гэта не ўдавалася, ён пераходзіў, скажам, на графічны факультэт. Гэтаму "бачнаму колеру" надавалася асаблівае значэнне.

Вельмі даўно я прачытаў тоўстую кніжку Акіма Валынскага "Леанарда да Вінчы" выдання 1900 года, адна з цытат з якой, пра Джаконду, узгадалася мне ў ВХУТЕМАСе і не забылася дасюль. Гучыць яна прыкладна так: "А магчыма, Леанарда цікавіла не таямнічая ўсмешка загадкавай жанчыны, а проста спалучэнне зялёных і блакітных тонаў?". Гэта — "па-вхутэмасаўску"! Усмешкай Джаконды мы зусім не цікавіліся, бо інстытут наш трымаўся на "спалучэннях" — толькі не "тонаў", а "колераў". Тоны ў старых майстроў — колеры ў нас. І зараз я не буду пісаць карціну, калі колеравыя рашэнні мне не цікавыя.

Хто яшчэ выкладаў у нас? Роберт Фальк, Давід Штэрэнберг і — з аднолькавым са мной прозвішчам — Аляксандр Шаўчэнка. Дарэчы, у мяне часта пыталіся: ці не сваяк ён мне? Не, адказваў я, Аляксандр Васільевіч — харкаўчанін, я ж — беларус з Гомельшчыны; ён — з сям'і прыказчыка, я — сялянскі сын. Сам я моцна сябраваў з маімі аднагодкамі-равеснікамі Расціславам Барто і Васем Пачыталавым. Дзякаваць богу, яны і зараз жывуць ды працуюць у Маскве (Р.Барто памёр у 1974 годзе, В.Пачыталаў — у 1973-м. — **Б.К.**). Як усе вхутэмасаўцы, я насіў кашулі з адкрытым каўняром і закасанымі рукавамі. У гэтым сэнсе Пачыталаў быў экстравагантны: прамыя доўгія рудыя валасы, зачасаныя на прамы прабор, куртка накшталт талстоўкі і вельмі шырокія зверху і вузкія ўнізе штаны. У дадатак да ўсяго — вялізны бант!

Некалькі месяцаў я наведваў майстэрню Аляксандра Шаўчэнкі. У адрозненне ад іншых, пастаноўкі ў яго мелі прадметна-сюжэтны характар. Я памятаю пастаноўку, дзе стол з абрусам, самавар, чайнік, хлеб, цукар, кубкі рабілі ўражанне нейкай вялізнай чайной. Хадзіў я і ў майстэрню Дзмітрыя Кардоўскага. Сам ён запомніўся як вельмі прыгожы чалавек: арліны нос, кучаравая барада, вогненныя выразныя вочы. Капялюш, штаны-галіфэ, цірольскія панчохі і цяжкія чаравікі дапаўнялі элегантны вобраз. А якія легенды існавалі пра Давіда Штэрэнберга, які выкладаў у суседняй майстэрні! Распавядалі, што ён напісаў свайго знакамітага аднаасобніка, распластаўшы мадэль на палатне і старанна абмаляваўшы вугалем яе сілуэт.

Аднойчы прыехалі госці: Маякоўскі, Осіп Брык, малады паэт Сямён Кірсанаў і таксама малады мастацтвазнаўца Фёдараў-Давыдаў. Сход быў шумным, Маякоўскага віталі з захапленнем. Зняўшы пінжак, ён павесіў яго на спінку крэсла. Стрыжаны нагала, паэт быў у белай кашулі і пры гальштуку. Ён і Кірсанаў чыталі вершы. Потым нас пачалі папракаць адсталасцю. Асабліва Осіп Брык. Ён казаў, што хутка "магутныя пражэктары будуць на гарадскім начным небе замацоўваць каляровыя феерыі"; што мы, студэнты, нібыта авангардысты, але "чапляемся за свінячыя гэндзлікі", заклікаў да "вытворчага" мастацтва, захапляўся сучаснымі формамі аэрапланаў і аўтамабіляў Форда. А Фёдараў-Давыдаў наогул казаў, што мастаку-станкавісту няма месца ў нашым грамадстве. Усё гэта бянтэжыла нашы галовы. Мы вельмі хацелі быць перадавымі, але яшчэ больш хацелі пісаць "свінячымі гэндзлікамі". Потым слова ўзяў Давід Пятровіч Штэрэнберг. Сэнс ягонай цудоўнай прамовы: не звяртайце ні на што ўвагі, гэта толькі вечар успамінаў, і зусім не істотна, ці будуць пасля пражэктары альбо ўсе мы станем маляваць "свінячымі гэндзлікамі". Можна, казаў ён, маляваць і цвіком, галоўнае — што сказаць і як сказаць. Аплядысменты былі бурныя. Надышлі новыя часы: троху пазней Маякоўскі амнісціраваў Рэмбранта. Аднойчы да нас прыехаў знакаміты мексіканскі мастак Дыега Рывера. На сустрэчы са студэнтамі ВХУТЕМАСа ён прачытаў нам па-французску лекцыю пра сучасны жывапіс. Перакладаў Штэрэнберг. У перапынку мы былі так узбуджаны пачутым, што ледзь-ледзь не пабіліся, ацэньваючы тыя або іншыя з'явы мастацтва.

Я пайшоў у майстэрню Штэрэнберга. Першая мая работа там — партрэт бялявай Стасі. Яе, аднак, пісалі ўсе. На сценах майстэрні — рэпрадукцыі Дам'е і Цінтарэта. Памятаю маіх таварышаў: Капланскага, нязграбнага, у кепцы, з неахайна завязаным гальштукам; Сяргея Бушынскага, родам з Вінніцы, прыгожага, хворага, вельмі сур'ёзнага чалавека. Памятаю графіка Лёню Зусмана. Ён прыехаў з Ленінграда, разняволены, вясёлы, выглядаў піцерскім "братком", добра чытаў вершы Маякоўскага і Франсуа Віёна. У гэўным сэнсе ён быў маім зямляком: з горада Гродна. А як можна забыць вельмі таленавітую і прыгожую Таю Лебедзеву з рэнуараўскай грыўкай, якая пісала "пад Дзюфі і Маціса"; вясёлага і вынаходлівага Мішу Гурэвіча са Смаленска, які цудоўна танцаваў!.. Пасля вайны я даведаўся, што малодшы лейтэнант Гурэвіч, камандзір узвода "саракапятак", па-гераўску загінуў у 1943-м у баі на Смаленшчыне і яму было нададзена званне Героя Савецкага Саюза. Сябраваў з Ванем Іваноўскім, Косцем Дорахавым, бакінцам Алікперам Рзакуліевым, які стаў пазней выдатным азербайджанскім графікам. Памятаю, як Дыега Рывера, пабачыўшы жывапісны твор Рзакуліева ў ВХУТЕМАСе, сказаў: "Вы на правільным шляху. Так і працягвайце працаваць".



А.Шаўчэнка. "Дзень Перамогі". 1966 г.

Увогуле, мы не прапускалі ніводнай выстаўкі — ні "правай", ні "левай". У той час прыхаваная барацьба кірункаў і груповак у мастацтве ўжо набірала моц, але пакуль яшчэ мірна суіснавалі такія супрацьлегласці, як, напрыклад, Давід Штэрэнберг і Дзмітрый Кардоўскі. Безумоўна, самай уплывовай і шматлікай арганізацыяй была Асацыяцыя мастакоў рэвалюцыйнай Расіі (АХРР) і арганізацыя моладзі, якая існавала пры ёй, — ОМАХРР. Многія з нас, вхутэмасаўцаў, уваходзілі ў яе склад, наведвалі яе студыю на Валхонцы, дзе пастаянна экспанаваліся невялікія выстаўкі, у тым ліку і нашы, студэнцкія. Ну і, натуральна, наведвалі музеі, асабліва — Музей новага заходняга мастацтва (з прыватных збораў братоў Шчукіных і І.Марозава), адкрыты ў 1928 годзе, і Музей іканапісу і жывапісу імя І.С. Астравухава. У гэтых музеях мы праводзілі практычна ўвесь вольны час.

Лета 1928-га я правёў у вёсцы Захаркава Краснагорскага раёна, каля падмаскоўнага пасёлка Архангельскі, дзе пісаў пейзажы, партрэты, невялічкія карціны і эцюды. У гэтыя часы я сябраваў з Мечыславам Васільевічам Дабракоўскім, які быў трошкі старэйшы за мяне. Выхадзец з беларускага мястэчка Відзы, што пад Браславам, ён прайшоў вельмі складаны шлях жыцця, служыў на Балтфлоце, сябраваў з В.Хлебнікавым. Вучыўся спачатку ў ВХУТЕМАСе (калі я жыў яшчэ ў Гомелі), потым, разам са мной, — у Ленінградскім інстытуце пралетарскага мастацтва, хаця пазнаёміліся мы раней, яшчэ ў Маскве. Ён быў таленавітым графікам, плакатыстам, ілюстратарам, жывапісцам і зрабіў на мяне нейкі ўплыў, заклікаючы да вялікай "інтэнсіфікацыі" выказвання. З гэтым я набыў і нейкі густ да гратэску.

Што потым здарылася з маім сябрам — не ведаю. Дзесьці чуў, што ён быў рэпрэсіраваны. (А.М. Шаўчэнка пры жыцці так і не даведаўся, што ў студзені 1938 года мастака расстралялі на Бутаўскім палігоне па абвінавачанні ў так званым шпіянажы на карысць шпіёнска-тэрарыстычнай польскай арганізацыі. На гэтым жа падмаскоўным палігоне былі расстраляны Раман Семашкевіч і Аляксандр Дрэвін. Дабракоўскі быў рэабілітаваны пасмяротна ў кастрычніку 1957-га. — **Б.К.**)

…Мінуў яшчэ адзін год. На пачатку 30-га разам з Дабракоўскім я ўступіў у ОСТ (Таварыства мастакоў-станкавістаў). Мы былі на парозе новага мастацтва. ВХУТЕМАС-ВХУТЕИН ішоў да свайго фіналу. Кажуць, што яго праграма была адарваная ад жыцця, занадта абстрагаваная. Тым не менш, у гэтай школе панаваў дух творчай бескарыслівасці і спаборніцтва, клопаты пра цэласнае вырашэнне жывапіснага палатна, пра форму, якая адна робіць акаляючы свет каштоўным.

І вось скончыліся гады навучання. Наперадзе быў цяжкі і доўгі шлях з тупікамі ды ростанямі, доўгія гады пошукаў і знаходак, памылак ды ўзлётаў. І ўсё ж ВХУТЕМАС назаўжды застаўся для мяне тым компасам, які дапамог мне знайсці свой уласны шлях. Ніколі не забудуся на маіх цудоўных педагогаў ды сяброў і той няўлоўны водар незабыўнага часу, які падарыў мне лёс…

Матэрыял падрыхтаваў
Барыс КРЭПАК

P.S. Акім Міхайлавіч не паспеў скончыць успаміны, дзе меўся распавесці пра сваю далейшую вучобу ў Ленінградскім інстытуце пралетарскага мастацтва (з 1932 года — Усерасійская акадэмія мастацтваў), пра вяртанне ў родныя мясціны, пра свае першыя буйныя поспехі ў мастацтве, калі ягоная карціна "Плытагоны" зрабіла сапраўдны фурор у тагачасным жывапісе "атакуючага сацрэалізму". Ён хацеў расказаць мне пра тое, як ваяваў на франтах Вялікай Айчыннай і як складана ішло станаўленне нашага мастацтва ў першыя пасляваенныя гады…

Не паспеў… Магчыма, у гэтым ёсць і мая віна: дробязная занятасць, штодзённая мітусня, творчая "цякучка" адсоўвалі нашыя сустрэчы ці то "на заўтра", ці то "на наступную нядзелю", ці то "на потым". А "потым" ужо не надышло… Дасюль вельмі шкадую аб гэтым…

АК Афіша "К"

з 23 лютага — да 2 сакавіка

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
- Выстаўка адной карціны Адама Шэмеша **"Партрэт Людвіка Кандратовіча (Уладзіслава Сыракомлі). 1854"**(Са збору Літоўскага мастацкага музея)
- **"Польская кераміка XVIII — XX стст. з фондаў Верхнесілезскага музея з Бытома".**
- **"Мастак і час"** (да 90-годдзя Л.Шчамялёва).

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 87 96.

- Пастаянныя экспазіцыі: "Парадныя залы", "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча", "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
- **"Цярноўнік крэсаў".**
- **"Аўтапартрэт"** Валенція Ваньковіча.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка А.Вярбіцкага. **"Сучаснасць. Былое. Майстар".**

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.

Тэл.: (8–0222) 22 48 87.
- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.
- **"Вясельныя традыцыі Усходу. Японія. Індыя. Карэя".**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
- **"Водбліскі ваеннай славы".**
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст.".**
- **"Вайна 1812 г. у гісторыі Мінска".**

Выстаўкі:
- Выстаўка **Маляўнічае гістарычнае Палессе"** (сумесны праект Нацыянальнага гістарычнага музея і Беларускага саюза мастакоў).

Дом-музей I З'езда РСДРП *г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.*
- Выстаўка плаката **"Назаўжды".**

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"Мір стары — Мір новы"** (фотавыстаўка).
- **"Таварыства перасоўных мастацкіх выставак. XXI стагоддзе (Санкт-Пецярбург)"** .
- **"Рэмінісцэнцыя"** (выстаўка Ю.Каралевіча).

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: 8–01770 5 51 81, 5 31 96, 2 06 02

- Выстаўка **"Вера, Надзея, Уваскрэсенне"**. З Музея Рокішкскага краю (Літва).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:
- **"Шляхам Янкі Купалы да Якуба Коласа".**
- **"Якуб Колас — народны паэт Беларусі".**

Выстаўкі:
- Да міжнароднага дня роднай мовы **"Выданні твораў Якуба Коласа на мовах свету".**
- **"Мае дарагія сябры"** (да 120-годдзя дня нараджэння Максіма Гарэцкага).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце.
- Выстаўка **"Сустрэчы з Гофманам"** з фондаў Калінінградскага абласнога гісторыка-мастацкага музея.
- Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.
- Інтэрактыўная гульня **"У пошуках папараць-кветкі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 56 21.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"1812 г. Вайна і мір".**

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11. Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- Эксклюзіўны арт-праект **"Мастакі Парыжскай школы з Беларусі".**
- **Выстаўка аднаго экспаната — фарфоравай вазы, выробленай у Францыі ў сяр. XIX ст. на Сеўрскай мануфактуры.**
- **"Антыкварыят. Палацаў страчаная раскоша..."** (з прыватнай калекцыі С.Пуціліна).

ПАСПЯШАЙЦЕСЯ НА ПОШТУ!

НАГАДВАЕМ! ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" НА САКАВІК І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ І-ГА ПАЎГОДДЗЯ 2013 г.

Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752.

Выстаўкі:
- **"Апякункі паэтычных нябёс".**
- **"Запавет Максіма Беларуса"** (да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага).
- **"Ходзіць Сон ля вакон..."** (прысвечана беларускай перадачы "Калыханка").
- **"А.П. Чэхаў. Лінія жыцця"** з фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея-запаведніка А.П. Чэхава "Меліхава" (Расія).
- **"Паўночныя традыцыі ў матэрыяльнай культуры Гомельшчыны X — XII стст. (у свеце археалагічных старажытнасцей)".**
- **"Гомельская вобласць. 75 слаўных гадоў".**

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня".**
- "Запа ўрачыстых прыёмаў".
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя). *Вежа палаца*

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:
- **"Конны партрэт генерал-фельдмаршала І.Ф. Паскевіча (1874 г.)"** (выстаўка адной карціны з калекцыі Д.Асташонка).
- **"Мінулага прасочваючы ніць..."** (мемуарная літаратура канца XVIII — XX стст.).
- **"Класікі беларускага мастацтва".** *Паўночнае крыло палаца*

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстаўкі:
- Куток жывых экзатычных рэптылій. *Зімовы сад* Свет субтрапічных раслін і жывёл.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА ГОМЕЛЯ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 32. Тэл.: (80232) 74-28-23.

Экспазіцыі:
- Інтэр'еры гарадскога асабняка к. XIX — пач. XX стст.
- Прагулкі па старым Гомелі.
- Гісторыя Гомеля ад старажытнасці да пачатку XX ст.

Выстаўкі:
- Фотаапараты і фотатэхніка XX ст. (каля 100 адзінак).

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ

г. Гродна, вул. Замкавая, 16. Тэл.: (8-0152) 74 25 13.

Экспазіцыі:
- **"Рэлігія і культура ў Беларусі"** (ад старажытных часоў да XXI ст. — архаічныя вераванні, хрысціянскія канфесіі, іслам, іудаізм).
- **"Эпоха. Час. Будынак"**(гісторыя палаца, у якім размешчаны музей, сямейныя традыцыі і каштоўнасці XIX — пач. XX стст.).

Выстаўка:
- **"Пад Віфлеемскай зоркай"** (мастацкія творы з перламутру, ражджэсцвенскія паштоўкі канца XIX — пач. XX стст.).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- Выстаўка **"Салдацкі доўг".**
- На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі".**

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 22 44.

- Пастаянная экспазіцыя **"Прырода Лідчыны".**

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна...".**
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст.".**
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны".**
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!".**
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
- Турыстычна-пазнавальная праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.

ТЭАТР

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

Гастролі Нацыянальнай оперы "Эстонія"
- **24, 26 — "Марная перасцярога"** Л.Геральда.
- **24 — "Viva Вердзі"** (Музычныя вечары ў Вялікім).
- **27** — Канцэрт **"Штраўс запрашае".**
- **28 лютага — "Анюта"** В. Гаўрыліна.
- **1 сакавіка — "Яўгеній Анегін"** П.Чайкоўскага.
- **2 — "Вяселле Фігара"** В.А. Моцарта.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7. Тэл./факс: 227 60 81.

На Малой сцэне Канцэртнай залы "Мінск"
- **25 — "Старамодная камедыя"** А.Арбузава.
- **27 — "Беларусь у фантастычных апавяданнях"** Я.Баршчэўскага.

На сцэне Палаца культуры прафсаюзаў:
- **23 — "Хам"** паводле Э.Ажэшка.
- **24, 25 — "Людзі на балоце"** паводле І.Мележа.
- **27 — "Паўлінка"** паводле Я.Купалы.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.
- **24 — "Адамавы жарты"** С.Навуменка.
- **25** — Канцэрт Алеся Камоцкага **"Канцэрт для сяброў".**
- **26 — "Чарнобыльская малітва"** С.Алексіевіч.
- **27 — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** Д.Балыка.
- **28 лютага — "Інтымны дзённік (Дзённік паэта)"** С.Кавалёва.
- **1 сакавіка — "Адэль"** Я.Таганава.
- **2 — "Ліфт"** Ю.Чарняўскай.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.
- **23 — "Чароўная лямпа Аладдзіна"** М.Самойлава.
- **"Лятучая мыш"** І.Штраўса.
- **24 — "Бураціна.BY"** А.Рыбнікава.
- **"Шклянка вады"** В.Кандрусевіча.
- **25 — "Праўдзівая гісторыя паручніка Ржэўскага"** В.Баскіна.
- **26 — "Мая жонка — ілгуння"** В.Ільіна, В.Лукашова.
- **28 лютага — "12 крэслаў"** Г.Гладкова.
- **2 сакавіка — "Чырвоны Каптурык. Пакаленне NEXT"** А.Рыбнікава.
- **2 — "Марыца"** І.Кальмана.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
- **23 — "Кветачка-вясёлка"** В. Катаева.
- **24 — "Яшчэ раз пра Чырвоны Каптурык"** С.Яфрэмава, С.Когана.
- **2 сакавіка — "Воўк і раз, два, тры..."** Н. Мацяш.

Спектаклі для дарослых
- **27 — "Жураўлінае пяро"** Дз. Кінасіта.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.

- **З 1 сакавіка —** выстаўка-кірмаш сучасных традыцыйных рамёстваў **"Млын".**

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1. Тэл.: 327 26 12.

- Фотавыстаўка беларускіх фотамастакоў **"Прыступкі".**

КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ
Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:
Марына САМОНЧАНКА (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН.
Спецкарэспандэнты:
Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.
Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 290 22 50, (017) 286 07 97, (017) 334 57 23
Тэлефон/факс: (017) 334 57 41
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by
E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
***Матэрыял на правах рэкламы.**

"Культура", 2013.
Індэксы 63875, 638752
Наклад 7542
22.02.2013 у 15.30
Замова 843
Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.

Дырэктар — ПРЫКО Алег Васільевіч
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна
Намеснік дырэктара па маркетынгу — СІДАРЭНКА Антон Васільевіч

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Тэл.: (017) 290 22 50 (прыёмная). Бухгалтэрыя: тэл.: (017) 334 57 35